Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 763.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Незкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу 1 інвэстародзьня — 20 к. месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпаралі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпаралі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок пашпаралі поруч тэксту 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьмі тэрмін бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 3½ кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Белдзяржгандлю і ў усіх пашт.-тэл. канторах. ABBEСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 237 (2726) Серада, 16-га кастрычніка 1929 г.

БУЙНЫ КАЛГАС ІМЯ ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

У „Дзень ураджаю і калектывізацыі“ у Клімавіцкім раёне арганізован буйны калгас на 1500 гэкт. імя газэты „Савецкая Беларусь“

Соскін.

Да канца выкрыем правых апартуністаў.

Скандальнае банкроцтва правай апазіцыі зараз ужо зусім наяўна. Беспрасьветныя прагнозы і посьмістычныя прароцтвы наўтомных ідэолёгаў правага ўхілу былі ў кароткі тэрмін ушчэнт разьбіты жыцьцём.

Бясконца далёкімі ад сапраўднага жыцьця, ад сапраўдных шляхоў сацыялістычнага будаўніцтва апынуліся палавінчатыя «заметкі эканаміста», у якіх т. Бухарын, усьлед за буржуазнымі эканамістамі, з сарказмам заўважаў, што в цаглін будучага нельга будаваць памяшканьняў фабрык і кватэр. Наперакор капітуляцкім прадказаньням удалося ў такой ступені фарсіраваць выраб будаўнічых матар'ялаў, што нібыта „нежаданьне“ і „нерэальныя“ тэмпы капіталістычнага будаўніцтва былі перасягнуты.

Мы дамагліся ў мінулым гаспадарчым годзе пашырэньня плянуемай часткі прамысловасьці на 24 проц. А ні для каго-ж не сакрэт, што намечаны кантрольнымі лічбамі рост прамысловасьці на 21,4 проц. правыя ўхілісты лічылі немагчымым для выкананьня заданьнем.

Адзінымі правільнымі бальшавіцкімі паводзінамі перад такімі фактамі было-б адкрытае прызнаньне сваіх буйных і сур'ёзных палітычных памылак.

Ня менш сурова пасьмялялася жыцьцё над прадказаньнямі лідэраў правага ўхілу аб стане і пэрспэктывах разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Відома, што правыя апартуністы даволі адкрыта гаварылі аб дэградацыі сельскай гаспадаркі. Аднак, пашырэньне пасеўных абшараў на 6 проц., вытворчы ўздым асноўных мас сялянства, бурны і масавы рост калгаснага руху, павялічэньне прадукцыі савгасаў на 34,7 проц., а прадукцыі калгасаў—на 24,6 проц. зьяўляюцца бясспрэчным доказам правільнасьці сельска-гаспадарчай палітыкі партыі і неадхільным доказам правалу апартуністычных прагнозаў правых.

Вялікія посьпехі ўжо ў першым годзе пяцігодкі былі дасягнуты партыяй ня толькі насупроць прадказаньням правых, але і ў рашучай барацьбе з імі, упарта перамагаючы супраціўленьне правых элемэнтаў, няўхільна выкрываючы іх пэвер'е ў творчыя сілы рабочай клясы, партыя дамаглася сапраўдных буйных перамог на гаспадарчым фронце. Гэта ёсьць адзін з галоўных вынікаў мінулага году, якіх мы не дазволім нікому замазваць.

Правыя ўхілісты настайваюць на сваіх пазіцыях, абвастраючы свае нападкі на партыю. Усё гэта прымушае нас яшчэ больш завастрыць нашу ўвагу і разгортваць барацьбу супроць правых ва ўсіх галінах — у тэорыі і на практыцы. Мы павінны с в а я ч а с н а і ш п а р к а выкрываць палітычныя выступленьні правай апазіцыі супроць лініі партыі. А такія выступленьні не такія ўжо рэдкія. Яны становяцца асабліва небясьпечнымі затым, што празьія карыстаюцца фракцыйнымі мэтадамі барацьбы супроць партыі, там-сям, пры наліччы кругавой парукі сярод абаронцаў правага ўхілу магчыма нават цкаваньне тых, хто рашуча абараняе лінію партыі.

Лёгіка барацьбы вядзе прыхільнікаў правай апазіцыі, якія не жадаюць прызнаць дапушчаных памылак, на шлях фракцыйнасьці. Анапімная лістоўка ў абарону поглядаў Бухарына і бухарынскай школы маладых, вылазка ва маскоўскім тормазным цэхадзе, фракцыйныя гутаркі, элемэнты фракцыйнасьці сярод невялічкай групы прыхільнікаў правых у Прамакадэміі, паводзіны актыўных прадстаўнікоў правага ўхілу на чыстцы—усё гэта зьвеньні нарастаючай фракцыйнасьці.

Партыя ня можа таксама прайсьці міма фракцыйных паводзін некаторых актыўных прыхільнікаў правых у часе чысткі. Яны адказвалі на запытаньні праверачных троек з такою-ж нішчырасьцю, як у свой час трацкісты адказвалі кантрольным камісіям. Зьдзяйляе стандарт слоў правых на чыстцы. Відаць, што прыхільнікі правага ўхілу рыхтавалі свае выступленьні прыблізна на аднэй шпаргалцы. У сваіх палітычных выступленьнях правыя ня спыняюць фальшывай гульні. З аднаго боку, яны заяўляюць аб сваёй згодзе з лініяй партыі і яе пастановамі, а з другога—яны згаджаюцца з лініяй т. Бухарына і не згаджаюцца з пастановамі партыі аб т. Бухарыне. Цану падобнай нішчырасьці партыя ўстанавіла яшчэ ў пэрыяд барацьбы з трацкізмам.

Рашуча выкрываючы палітычныя выступленьні правых апартуністаў, партыя з бальшавіцкай няўхільнасьцю і з усёй суровасьцю будзе перасякаць фракцыйныя вылазкі правых. Фракцыйнасьці і групоўшчыны партыя не пацерпіць.

Партыя будзе прадаўжаць усебаковую, глыбока прынцыповую барацьбу з правымі. Прапагандысцкія кадры партыі здолеюць даць адпор рэвізіянісцкім тэорыям партыі.

Партыя будзе нясупынна змагацца супроць апартуністычнай лініі правых, яшчэ больш уважліва і больш пільна сачыць за іх выступленьнямі, не дапушчаючы, каб партыйная трыбуна выкарыстоўвалася для прапаганды антыленінскіх поглядаў.

Адначасна з усёй суровасьцю і ня шчаднасьцю партыя ўдарыць па руках усім, хто ў барацьбе з партыяй пушчае ў ход фракцыйную зброю. Упарта і настойліва партыя будзе змагацца за няўхільнае правядзеньне партыйнай лініі ва ўсёй працы ўсіх арганізацый.

«ПРАВДА».

Тав. Гамарнік назначан членам РВС СССР.

МАСКВА. Саюзны СНК назначыў т. Гамарніка Яна Барысавага членам Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету Саюзу ССР.

Дэманстрацыя 5 тысяч гарнякоў

пад лёзунгам няхай жывуць Саветы.

ПАРЫЖ, 14-X. Учора ў Лаўсе ў сувязі са сканчэньнем зьезду ўнітарных гарнякоў адбылася дэманстрацыя 5 тысяч гарнякоў з чырвонымі сьцягамі, сьпевам „Інтэрнацыяналу“ і выгукамі: „Няхай жывуць Саветы“, „няхай жыве Марты“, „патрабуем амністыі“. Перад дэманстрацыяй паліцыя арыштавала прадстаўніка эсэнскіх гарнякоў Функа, які прысутнічаў на зьезьдзе ў якасьці госьця. Функ быў зараз-жа высланы з Францыі. „Юманітэ“ адзначае, што рэвалюцыйныя гарнякі паўночнага басэйну, які да гэтага часу быў у руках рэфармістаў, упяршыню выйшлы на вуліцу пад кіраўніцтвам унітарнага саюзу.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Масавыя арышты беларускіх дзеячоў.

ВАРШАВА, 14-X. У Заходняй Беларусі ня спыняюцца масавыя арышты беларускіх дзеячоў. У сувязі з гэтым, буржуазная беларуская фракцыя сойму ўхваліла падаць вотум недавер'я міністру ўнутраных спраў Складкоўскаму.

Вялікія паветраныя манэўры ў Польшчы.

ВАРШАВА, 14-X. У Польшчы адбываюцца вялікія паветраныя манэўры. Мэта іх ня толькі вучэбная, але і агітацыйная. Інсцэніруюцца наскокі на розныя гарады. Учынены ўжо „наскокі“ на Варшаву, Вільню і іншыя гарады.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР

АБ ТЭРМІНАХ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР, РАСПАРАДЧЫХ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР (САКРАТАРЫЯТУ ЦВК) І КАМІСІЙ ЦВК БССР.

Прэзыдыум ЦВК БССР **пастанавіў** устанавіць пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР, Распарадчых Пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК БССР (Сакратарыяту ЦВК БССР) і сталых Камісій ЦВК БССР **штомесячна** у наступныя **лічбы**:

1. Прэзыдыуму ЦВК БССР — 7, 17 і 27 а 10-й гадзіне раніцы.

2. Распарадчых Пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК БССР Сакратарыяту ЦВК БРСР)—1, 11, 21 а 10-й гадзіне раніцы.

3. Сталых Камісій ЦВК БССР: (Нацыянальнай Камісіі, Цэнтральнай Камісіі па паленшаньні працы і быту жанчын, Камісіі Прыватных Амністый, Цэнтральнай Выбарчай Камісіі, Камісіі Садзейнічаньня Дзяржкрэдыту і ашчадсправе, Камісіі па земляўпарадкаваньні працоўных яўрэяў. Вышэйшага Савету Фізічнае Культуры і інш.) у дні пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК БССР (7, 17, 27) а 6-й гадз. увечары.

А таксама 9, 19 і 29 а 6-й гадзіне ўвечары, па асобна ўстаноўленым парадку.

ПАВОДКА У ЛЕНІНГРАДЗЕ.

(Па радыё, атрыманым а 1-й гадз. ночы).

ЛЕНІНГРАД, 15-X. З прычыны цыклёну, які праходзіць ад берагоў Нарвэгіі, у фінскай затоцы ўтварыўся незвычайна моцны шторм. Судны, якія знаходзіліся ў моры, пасьпяшылі схавацца ў бліжэйшыя парты.

У фінскай затоцы сіла шторму дасягнула 10 баляў, а пасьля павялічылася да 15 баляў. У Ленінградзе з раніцы падуў моцны штормавы вецер, і вада да 11-й гадзіны раніцы паднялася на 1,2 мэтра вышэй ардынару. У многіх дамох ветрам вырваны вокны і разьбіты шыбы. З веркаў Петрапаўлаўскай крэпасьці было зроблена 5 выстралаў дзеля папярэджаньня насельніцтва Ленінграду і прыгарадаў аб пагрозе паводкі.

На Чырвоным Пуцілаўцы вада падышла да качагаркі. Ля заводу імя Марці падмыта набережная і на Няве вецер саваў некалькі буксірных суднаў. Па каналах плывуць дровы.

А 6-й гадзіне Нява вышла з берагоў на Адміралцейскай і Дварцовай набережных. Пад'ёмам вады дасягнуў 2,4 мэтраў (8 футаў). Весільлеўскі востраў у значнай частцы пакрыт вадой. Заліта уся гавань і частка вуліц, якія выходзяць на Чорную рэчку і на Няву. Вадой заліты многія буйныя заводы, што знаходзяцца на Васілеўскім востраве, у тым ліку радыё-завод „Комінтэрн“, „Техкабель“, скураны завод імя Жэлябава і інш. У выніку загадзя арганізаванай барацьбы ніякіх вестак аб ахвярах людзьмі пакуль што не паступала.

А 6-й гадзіне выступілі з берагоў Фэнсанка, канал Грыбаедава і Мойка Усюды заліты падвальныя памяшканьні.

На Фінляндзкай чыг. вада дасягла платна. Утворана надзвычайная тройка, а таксама раённыя тройкі па барацьбе з паводкай. Сфармаваны атрады з чырвонаармейцаў і курсантаў ваенных школ, якія накіраваны пад загад раённых троек. Мабілізаваны катэры, буксірныя параходы і лодкі для дзяжурства ў пагражаючых мясцох. Трамвайны рух спыніўся. Усе аўтамабілі мабілізаваны і перададзены надзвычайнай тройцы. На заводах, якія знаходзяцца ў нізкіх частках гораду, рабочыя пакінуты на дадатковую зьмену. Станкі пераносяцца з нізкіх паверхаў у верхнія. У пачатку 7 гадзіны вада ў Няве пачала ападаць і зьменшылася да 6 г. 30 хв. да 2,6 мэтраў.

АДЗІНЫ ФРОНТ С.-Д З ФАШЫЗМАМ СУПРОЦЬ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ.

Хорты клапоціцца аб сваіх верных служках.

ВЕНА, 14-X. На падставе апошніх вестак з Будапешту (Вэнгрыя) можна сказаць, што між сацыял-дэмакратыяй і Бэтленам намецілася некаторае зьбліжэньне. Бэтлен згадзіўся на дробныя ўступкі сацыял-дэмакратам, каб адмежаваць буржуазную апазіцыю і прыцягнуць сацыял-дэмакратаў на бок ураду ў такім пытаньні, як перагляд Трыянольскага дагавору.

Уступкі ўраду сацыял-дэмакратам даюць у выніку частковую амністыю. Афіцыёзна паведамляецца, што згодна прапановы Бэтлена, галава дзяржавы Хорты загадаў спыніць судовую справу супроць сацыял-дэмакратычных лідэраў Гарам і Бухінгера, якія жывуць у доме эміграцыі. Сацыял-дэмакратычная „Нэпсава“ імкнецца паказаць амніставаньне Горам і Бухінгера, як першы крок на шляху дэмакратызацыі Вэнгрыі.

Подлая правакацыя сацыял-дэмакратаў.

ВЕНА, 14-X. У Будапэшце (Вэнгрыя) 13-га кастрычніка адбыўся масавы сход, скліканы сацыял-дэмакратамі. Лідэры сацыял-дэмакратаў выступалі з пратэстамі супроць некаторых мерапрыемстваў ураду з яўнаю мэтаю адцягнуць увагу рабочых ад уступак ураду, якія зроблены за апошні час сацыял-дэмакратычнай партыяй.

Пасьля сходу больш за 10 тысяч рабочых, не зважаючы на загад паліцыі разыйсьціся, наладзілі дэманстрацыю, якая прайшла па галоўных вуліцах гораду. Чуліся выгукі „проч фашызм“, «проч згоду сацыял-дэмакратаў з урадам», «прэч узброеньні». У цэнтры гораду дэманстранты натыкнуліся на вялікі атрад конной паліцыі, якая атакавала працэсію. Дэманстрацыя была разагнана. Некалькі рабочых паранена. Учынена шмат арыштаў. Пасьля разгону дэманстрацый, рабочыя існо зьбіраліся групамі ў розных частках гораду і прадаўжалі дэманстраваць.

Здрадніцкая дзейнасьць рэфарміст аў.

БЭРЛІН. 10-X. Не зважаючы на шалёную кампанію прадпрыемцаў і рэфарміст аў супроць бастуючых трубапракладчыкаў, шэрагі бастуючых непарушны. Лік прадпрыемцаў, якія згаджаюцца на патрабаваньні бастуючых, расьце з кожным днём. Рух салідарнасьці з бастуючымі сярод будаўнічых рабочых таксама ўзрастае. Ні на аднэй пабудове, дзе працуюць штрэйкбрэхеры, будаўнічыя рабочыя не працуюць. Сэкцыя цесьляроў перадала бастуючым трубапракладчыкам 25 тысяч марак. Вялікую дапамогу бастуючым робіць нямецкая сэкцыя Міжрабпому.

* * *

ПАРЫЖ, 13-X. Забастоўка лёкаўтаваных у Парыжы шофэраў паштовых аўтамабіляў, з прычыны здрадніцтва рэфарміст аў, сарвана. З ліку шафэраў, якія вярнуліся на працу, адміністрацыя звольніла каля 40 актыўных удзельнікаў забастоўкі.

Надзеі рэфарміст цкіх прафсаюзаў.

ПАРЫЖ, 11-X. Учора ў Марсэлі адчыніўся зьезд рэфарміст цкага прафсаюзу гарнякоў. У дакладзе ЦК саюзу, вытрыманым у духу „клясавага міру“, выказваецца надзея, што абмеркаваньне пытаньняў вугольнай прамысловасьці, якое адбываецца ў камісіі Лігі Нацый, прывядзе ў адпаведнасьць попыт на вугаль з празьмернаю перавытворчасьцю.

За забойства рабочага ня судзяць.

НЬЮ-ЁРК. Суд прысяжных у Пітсбурдзе апраўдаў 3-х асоб, наёмных вартаўнікоў пітсбурскай вугольнай кампаніі, міністр фінансаў Мэлёна, якія сёлета ў лютым забілі гарніка Баркоскі. Забойства вартаўнікі маскавалі тым, нібыта Баркоскі парушаў закон аб сьпірытусовых напітках і „пры арыштце адпіраўся“. Вартаўнікі вызвалены пад заклад і будуць адказваць толькі за „забойства ня ўмысьля».

Галадоўка ў тэмашварскім астрозе.

ВЕНА, 10-X. Водлуг атрыманых тут паведамленьняў газэт, рэвалюцыйныя рабочыя-унітарысты, монстр - працэс якіх нядаўна слухаўся ў Тэмашвары, і якія адбываюць зьняволеньне ў тэмэшварскім астрозе, ад гэтага месяца абвясьцілі галадоўку, як пратэст супроць нечалавечых абыходзін з імі. Прагулкі скарачаліся да мінімуму, перадача газэт забаронена, вады дасецца такая малая колькасьць, што вазьмем нельга памыцца. Яны заявілі начальніку астрогу, што ня спыняць галадоўкі, пакуль ім ня будуць нададзены ўсе палёгкі, якімі павінны карыстацца палітычныя вязьні. У галадоўцы ўдзельнічае 10 рабочых, засуджаных да зьняволеньня на тэрмін ад 6 месяцаў да 1 году.

* * *

ВЕНА, 11-X. Як паведамляюць румынскія газэты, у астрозе Тэмашвары зусім асьлепі зьняволены ў пачатку гэтага году па працэсу камуністаў на 3 гады астрогу Макс Саломен.

ЧУТКІ АБ ЗАСНАВАНЬНІ ФРАНКА-НЯМЕЦКАЙ АРМІІ

ПАРЫЖ, 14-X. Часопіс „Эр Нувэль“ агаласіла падрабязнасьці перамоў, якія праводзіў у Бэрліне дэпутат рэйхстагу нацыяналіст Кленэ з францускім дэпутатам Рэйно. Гэтыя падрабязнасьці ўзяты газэтаю з штутыдзённіка «Люм'ер«, супрацоўнік якога быў камандыраваны ў Бэрлін і гутарыў з асобаю, знаёмаю з падрабязнасьцямі перамоў аб франка-нямецкім ваенным саюзе.

Водлуг слоў гэтай асьвядомленай асобы, прозьвішча якой супрацоўнік „Люм'ер“ не называе, Рэйно згадзіўся на заснаваньне франка-нямецкай арміі ў складзе 500 тысяч французаў і 300 тысяч немцаў. Рэйно не супярэчыў супроць звароту польскага калідору Нямеччыне. Больш таго, ён нібыта заявіў, што, калі Польшча адмовіцца далучыцца да франка-нямецкага блёку, даў Польшчу „кінуць на волю лёсу“.

Надыр-хан—падышах Аўганістану.

ТЭРМЭЗ, 15. Толькі што атрыманы весткі, згодна якіх Надыр-хан абраны сёньня падышахам Аўганістану.

КІТАЙСКІЯ БЕЛАБАНДЫТЫ НЕ СУНІМАЮЦЦА.

Бандыцкі налёт на памяшканьне савецкага консульства.

ПЭЙПІН, 14-X. 14-га кастрычніка 5 белагвардзейцаў уварваліся ў памяшканьне савецкага консульства ў Цзяцзыне і ўчынілі ў консульстве поўны разгром, зламаўшы ўсе пячаці, узламаўшы 2 негаручых шафы. Тры іншых негаручых шафы налётчыкі зламаць ня здолелі. У памяшканьні консульства пануе поўны вэралах, усё параскідана і паламана. Мясцовы нямецкі консул агледаў сёньня памяшканьне для складаньня пратаколу. Два белагвардзейцы былі хутка арыштаваны. У арыштаваных знойдзены пішучая машына і такое-сякое адзеньне, забранае з консульства. Ці будуць арыштаваны сапраўдныя віноўнікі налёту,—невядома.

Масавыя арышты савецкіх грамадзян.

ТОКІЁ, 13-X. Водлуг паведамленьня з Харбіну, у сувязі з забойствам Гіацынтава ўчынены масавыя арышты сярод западазроных савецкіх грамадзян і іх сваякоў. Абвешчана прэмія таму, хто знойдзе забойцу. Гіацынтаў быў начальнікам цэнтр-разьведкі ў Томску і Кацярынбурзе.

Сфабрыкаваны суд супроць савецкіх грамадзян.

ТОКІЁ, 13-X. З Манчжурыі паведамляюць, што харбінскі вайсковы штаб арганізаваў суд па справах савецкіх грамадзян, якія абвінавачваюцца ў „шкодніцтве“.

* * *

ТОКІЁ, 13-X. Водлуг паведамленьня з Харбіну, 10 кастрычніка на вуліцы 3 невядомых асобы забілі наглядчыка чыгуначнага „аддзяленьня па палітычных справах“ белагвардзейца Гіяцынтава. Харбінская белаэміграцкая прэса бяз ніякіх падстаў прыпісвае гэты ўчынак савецкім грамадзянам.

КАНІЦКАМУ ТЭХНІКУМУ КАЛЕКТЫЎНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі на асновах калектывізацыі патрабуе ад партыі і савецкае ўлады падрыхтоўкі значнага ліку спэцыялістаў з рабочых і сялян. Такою школаю, якая будзе рыхтаваць гэтых спэцыялістаў, і павінен зьявіцца новы адчыняемы Канецкі тэхнікум калектыўнага земляробства.

Шчыра вітаю будучых нашых чырвоных спэцыялістаў і жадаю посьпехаў у вашай штодзённай вучобе за ўзмоцненую калектывізацыю.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

УРАДАМ РСФСР, УССР І БССР.

Першы зьезд інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў аб'яднаных Заходніх чыгунак пасылае гарачае прывітаньне ўрадам РСФСР, УССР і БССР.

Зьезд глыбока перакананы, што Заходнія чыгункі, праходзячы праз Беларусь, Украіну і Беларусь, здолеюць выканаць усклаўдзеныя на іх задачы; усе чыгуначнікі Заходніх чыгунак згуртуюцца ў шчыльную агульную сям'ю, каб дружнай братэрскімі сіламі з гонарам выканаць пяцігадовы плян па рэканструкцыі транспарту. Некаторыя перашкоды, якія ў сучасны момант наглядаюцца ў перавозках, будуць пераможаны нашымі дружнымі сіламі, і Заходнія чыгункі дакажуць, што яны могуць быць баявой транспартнай адзінкай у агульнай сетцы чыгунак СССР.

Нехай жыве шчыльнае адзіньне Велікарусі, Украіны і Беларусі!

Нехай жыве УсеКП(б)!

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

Працоўныя Зах. Беларусі разарвуць ланцугі сацыяльнага і нацыянальнага ўціску

Рэзалюцыя пленуму сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР

Пленум сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР, заслухаўшы назначарговую інфармацыю аб новай правакацыі нацыянал-фашыстаў Луцкевіча, Астроўскага і К-о, якая выявілася ў тым, што яны без ведама і супроць волі засуджаных Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага і іншых таварышоў ад іх імя падалі польскай уладзе просьбу аб „памілаваньні“, заўважае:

Беларускія нацыянал-фашысты на чале з групай Луцкевіча—Астроўскага, зьяўляюцца аплаванай частнай польскага фашысцкага лягеру. Нацыянал-фашысты вядуць шалёную барацьбу супроць рабочых і працоўных сялян Заходняй Беларусі, дапамагаюць польскаму фашызму душыць працоўныя масы, садзейнічаюць яму ў анэксыцыяўленьні імпэрыялістычных плянаў супроць краіны Саветаў. Новай правакацыяй беларускіх нацыянал-фашыстаў яшчэ больш яскрава выявіл свой контр-рэвалюцыйны твар і лёйвайскае прыслужніцтва перад фашысцкім урадам Пілсудзскага. Іх новы манэўр быў накіраваны на тое, каб рэабілітаваць фашысцкі ўрад Пілсудзскага ў ганебнай камэдыі суду над Беларускай Грамадой.

Зьяўляючыся самымі злымі ворагамі нацыянал-вызвалеончага руху, да шэрагаў якога належаць засуджаныя паслы, беларускія нацыянал-фашысты выступаюць у фальшывай ролі іх „прыяцеляў“ і „абаронцаў“, каб пад гэтай маскай узмацніць яшчэ больш сваю барацьбу супроць рэвалюцыйнага руху і сваю працу на замацаваньню польскай акупацыі ў Зах. Беларусі і палёнізацыі краю.

Пленум ад імя навуковых працаўнікоў Беларусі шле сваё братэрскае прывітаньне правадыром Беларускае Грамады—Тарашкевічу і яго таварышам, якія адмежаваліся правакацыю Луцкевічаў і цьвёрда стаяць у рэвалюцыйных шэрагах. Пленум клянімць ганьбай беларускіх нацыянал-фашыстаў, як агэнтаў і наймітаў польскіх акупантаў і ідэалёгаў беларускае буржуазеі і кулацтва.

Пленум падкрэсьлівае, што ўсе гэтыя прыёмы польскага ўраду і яго лёкаяў ня здолеюць утаіць таго факту, што ў барацьбе з беларускім рэвалюцыйным рухам яны пацярпелі поўнае паражэньне.

Пленум верыць у моц нацыянальна-рэвалюцыйнага руху Зах. Беларусі, і, бачачы хвалю новага рэвалюцыйнага ўздыму, цьвёрда ўпэўнен у тым, што рабочыя і працоўнае сялянства Зах. Беларусі пад кіраўніцтвам КПЗБ разарвуць ланцугі сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, пакончаць з панаваньнем памешчыкаў і буржуазеі і злучацца з працоўнымі масамі Савецкае Беларусі.

Паводзіны нацыянал-фашыстаў Зах. Беларусі адзіным ланцугом зьвязваны з учынкамі нацыянал-дэмакратаў Савецкай Беларусі. Пленум запэўнае, што навуковыя працаўнікі разам з шырокімі працоўнымі масамі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будуць і надалей весьці яшчэ больш рашучую барацьбу з усялякімі правамі нацыянал-дэмакратызму і яго носьбітамі і будуць прымаць яшчэ больш актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, у будаўніцтве беларускае пралетарскае культуры.

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

па справе Віцебскага АК і АКК КП(б)Б у зьвязку з пратэстам рэдакцыі газэты „Заря Запада“ 11-X—29 г.

Разгледзеўшы вынікі расьсьледваньня ЦКК пратэсту рэдакцыі „Заря Запада“ на пастанову Аб'яднанага паседжаньня Віцебскага Бюро АК і прэзыдыуму АКК ад 17-IX—г. г. па справе аб недахопах у лекавых установах Акрінспэктарыяту аховы здароўя (у прыватнасьці па заметцы „Назревший гнойнік“ № 183), Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК **пастанаўляе:**

1. Прызнаць, што як расьсьледваньнем камісіі тав. Вінаградава, так і пастановай АК і АКК КП(б)Б па яго дакладу, у якой Віцебскія парторганы прызнаюць свае пастановы па гэтай справе буйнаю палітычнаю памылкаю, устаноўлена з усёй яскравасьцю, што пастанова АК і АКК па абвінавачваньні рэдакцыі газэты „Заря Запада“ ў тым,—„што яна зрабілася рупарам рэакцыйных элемэнтаў у справе Гусінскага, вяла сьвядомую траўлю аноннімга і не зразумела лёзунгу самакрытыкі, а таксама аб арганізацыйных вывадах супроць рэдакцыі (зьняцьце з працы нам. рэдактара Рубінштэйна і інш.)“, гэтая пастанова зьяўляецца ня толькі не адпавядаючай тым сапраўдна высьветленым фактам і недахопам у больніцы імя Леніна і ў іншых локавых установах, але гэтая пастанова на сваёй сутнасьці зьяўляецца нічым іншым, як недапушчальным выпадкам супроць лёзунгу партыі аб самакрытыцы, парушэньнем, якое павінна быць рашуча асуджана, як несуадпавядаючае ўсім досыць яскравым катэгарычным дырэктывам партыі аб самакрытыцы, як важнейшым мэтадзе „выхаваньні партыі, рабочае клясы, мас“.

2. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б прымае да ведама пастанову аб'яднанага пасяджэньня Бюро АК і прэзыдыуму АКК аб адмене сваёй пастановы ад 17-IX—29 г. па справе Гусінскага, як палітычна памылковай пастановы, не абгрунтаванай і накіраванай супроць правільнага бальшавіцкага разуменьня лёзунгу самакрытыкі. Заслухаўшы тлумачэньне сэкратара АК тав. **Арошштама** і сэкратара АКК тав. **Жмырко** і ўлічваючы прызнаньне Віцебскімі парторганамі сваёй пастановы буйнейшай палітычнай памылкай, Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК абмяжоўваюцца тым, што адмяняючы гэтую пастанову ставяць на від Бюро АК і прэзыдыуму АКК за дапушчаную імі палітычную памылку і папераджаюць аб недапушчальнасьці ў далейшым гэтых буйнейшых недахопаў у галіне самакрытыкі. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК адначасова канстатуюць, што першапачатковае неправільнае рашэньне АК і АКК па справе Гусінскага зьяўляецца асобнай сур'ёзнай памылкай у справе разгортваньня самакрытыкі, але не характарызуе адносін Акругкому і АКК да самакрытыкі, бо ў цэлым Віцебскі АК і АКК правядзова і рашуча разгортваюць самакрытыку.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК пры гэтым ухваляе пастанову Бюро АК і Прэзыдыуму АКК аб скліканьні ўнечарговага аб'яднанага пленуму АК і АКК КП(б)Б з пастаноўкай на ім ва ўсёй шырыні пытаньняў аб недахопах у разгортваньні самакрытыкі. Гэтая шчырая бальшавіцкая пастаноўка сваіх буйнейшых недахопаў на абгаварэньне партарганізацыі з боку АК і АКК дае Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК упэўненасьць у тым, што АК і АКК ня толькі рашуча выправяць сваю памылку, але і пойдуць па шляху далейшых дасягненьняў па разгортваньні самакрытыкі.

3. Разгледзеўшы паводзіны Прэзыдыуму АКК у гэтай справе, Прэзыдыум ЦКК ставіць у асобную віну Прэзыдыуму АКК, у прыватнасьці сакратара АКК тав. **Жмырко** тое, што Прэзыдыум АКК вывады сваёй камісіі па справе Гусінскага не разглядзеў на паседжаньні АКК і нават не прапрацаваў матар'ялаў камісіі, у выніку чаго былі адхілены вывады і прапановы камісіі, якія ледзь былі нездавальняючымі, але не заключалі ў сабе той палітычнай памылкі, на шлях якой потым сталі Прэзыдыум АКК і Бюро АК. Улічваючы, што палітычна памылковая пастанова АК і АКК зьяўляецца бясспрэчным пасьведчаньнем слабасьці разгортваньня самакрытыкі ў партарганізацыі, калі партыйныя органы не ахопліваюць поўнасьцю ідучую зьнізу самакрытыку мас, калі ў асаблівасьці па лініі АКК маюць месца асобныя выпадкі нездавальняючага рэагаваньня на заметкі ў друку (справа камітэту ўзаемадапамогі, таварыства „Друзья детей“ і інш.), нерашучасьці ў барацьбе з асобнымі правямі бюракратызму, Прэзыдыум ЦКК прапануе АКК прыняць самыя рашучыя меры да ўдасканаленьня і паскораньня рэагаваньня на запросы мас і самакрытыку да паленшаньня абсьледвацельскай працы і праверкі выкананьня і, улічваючы неабходнасьць дапамогі ЦКК у сэнсе паленшаньня працы АКК,—прэзыдыум лічыць неабходным у бліжэйшы час правесьці інструктарскае абсьледваньне працы Віцебскай АКК-РСІ, што даручыць оргтрупе ЦКК. Прэзыдыум ЦКК даручае таксама АКК абгаварыць пытаньне аб паленшаньні працы Прэзыдыуму АКК і ў прыватнасьці паводзіны сакратара АКК т. **Жмырко**, які ніякіх мер ня прыняў да праверкі дастатковасьці абсьледваньня камісіі і абароны тых, хаця недастатковых прапаноў камісіі, якія аднак і не зьяўляліся палітычна памылковымі.

4. Заслухаўшы тлумачэньні старшыні Віцебскай АКК тав. **Мундаў**, які ў часе выдасьненьня пастановы Бюро АК і Прэзыдыуму АКК адсутнічаў,—прэзыдыум ЦКК прымае да ведама заяву тав. **Мундаў** аб асуджэньні ім недапушчальнай пастановы Бюро АК і Прэзыдыуму АКК і аб тым, што камісія і Прэзыдыум АКК якія павінны былі выправіць справу па заметцы рэдакцыі газэты „Заря Запада“, ня ўлічылі тых яго дырэктыў і даручэньняў, якія ім былі дадзены ў адносінах расьсьледваньня справы.

5. Прапанаваць АКК разглядзець пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці ўсіх асоб, якія праходзяць па справе Гусінскага і інш., у прыватнасьці ў адносінах працаўнікоў Акрінспэктарыяту Аховы Здароўя, якія правялі недапушчальныя адносіны да самакрытыкі, ігнараваньне яе і няпрыняцьце належных мер да рэагаваньня на заметкі ў друку. Даручыць інструктару ЦКК у часе абсьледваньня Віцебскай АКК афарміць матар'ял расьсьледваньня і далажыць АКК. У адносінах **Кантаровіча** ўлічыць матар'ялы Аршанскай і Віцебскай пракуратуры.

6. Адзначаючы няправільную лінію дзейнасьці Акрпраўленьня Саюзу Мэдсанпрацы, якая выказалася ў адсутнасьці твару саюзу і бязьдзейнасьці яго ў барацьбе са зьявішчамі бюракратызму ў органах аховы здароўя, у непрыняцьці мер да пастаноўкі правільнай работы сярод урачэбнай грамадзкасьці ў сэнсе барацьбы з антыграмадзкімі настроямі часткі ўрачэбнага пэрсаналу, даручыць фракцыі ЦП саюзу Мэдсанпрацы правесьці тэрміновую праверку працы саюзных арганізацый акругі і прыняць належныя меры па паленшаньні іх працы.

7. Указаць камісіі АКК у складзе—члена прэзыдыуму т. **Падскочы**, члена АК тав. **Галынкіна, Чэрняк, Файнбурга, Васільлева і Айзэнбэрга**, што камісія ня высьветліла ў дастатковай ступені ўсе даныя, зьмешчаныя

Праверым дагаворы па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Менскі дражджавы завод „Чырвоная Зорка“ значную колькасьць пунктаў догавору выканаў. —На віцебскіх прадпрыёмствах рабочыя масы слаба ўцягнуты ў сацыялістычнае спаборніцтва.—На вёсцы спаборніцтва разгорнута слаба.

Мабілізуем шырокія масы рабочых для праверкі дагаворау.

Некаторыя пункты дагавору ня выкананы.

(Менскі дражджавы завод „Чырвоная Зорка“).

На Менскім дражджавым заводзе „Чырвоная Зорка“ закончылася праверка выкананьня дагавору па сацыялістычнаму спаборніцтву за трэці квартал сёлетняга году.

Менскі дражджавы завод „Чырвоная Зорка“ 28 мая заключыў дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з Маскоўскім дражджавым заводам „Моссельпрома“, Кіеўскім „Чырвоны дражджавік“ і Віцебскім дражджавым заводам „Пралетары“.

Вынікі праверкі выкананьня дагавору паказалі, што Менскі завод „Чырвоная Зорка“ большасьць пунктаў дагавору выканаў з перавышэньнем, апярэдзіўшы Маскоўскі, Кіеўскі і Віцебскі дражджавыя заводы.

Па прамфінпляну было намечана ў сёлетнім годзе зьніжіць сабекошт на заводзе „Чырвоная Зорка“ да 35,56 кап. за 1 кілёграм дражджэй. Паводле ўмовы завод абавязаўся зьніжіць сабекошт да 33 капеек за 1 кілёграм да канца гаспадарчага году. Як паказала абсьледаваньне, за трэці квартал завод зьнізіў сабекошт да 33,43 капеек, уключаючы сюды ўтрыманьне халадзільніка, расход на які ня быў прадугледжаны пры заключэньні ўмовы. Утрыманьне халадзільніка абходзілася заводу 0,2 капейкі за мінулы квартал.

Па заводу „Моссельпрома“ прамфінпляном прадугледжалася зьніжіць сабекошт да 39,49 капеек за 1 кілёграм; паводле дагавору завод павінен быў зьнізіць да 38,87 капеек, а ў сапраўднасьці сабекошт зьніжаны да 42,26 капейкі (невыкананьне 3,39 капейкі). Кіеўскі дражджавы завод „Чырвоны дражджавік“ абавязаўся зьнізіць сабекошт да 36 капеек, а зьнізіў толькі да 37,46 капейкі за кілёграм дражджэй.

Прамфінпляном было намечэна за ўвесь гаспадарчы год вырабіць 2304750 кілёграмаў дражджэй. Да верасьня месяца выраблена 2235755 кілёграмаў. Па дагавору завод „Чырвоная Зорка“ павінен быў вырабіць у першым паўгодзьдзі 1417500 кілёграмаў, а выраблена за трэці квартал усяго 607583 кілёграмы дражджэй. Такім чынам пункт дагавору аб павялічэньні прадукцыі ня выкананы. Гэта самае зьявішча заўважаецца і па іншых заводах, з якім завод „Чырвоная Зорка“ уступіў у спаборніцтва.

Прычыны невыкананьня ўмовы ўсімі заводамі аднолькавыя,—гэта слабы збыт прадукцыі.

Па дагавору на другое паўгодзьдзе завод „Чырвоная Зорка“ павінен быў зьнізіць прагулы да нуля, а зьніжаны за другі квартал да 0,05 процантаў. Невыкананьне тлумачыцца тым, што рабочыя адсутнічалі на працы на ўважлівых прычынах, як напрыклад, хвароба, альбо сьмерць членаў сям'і; а умове гэткія выпадкі не прадугледжаны, дзякуючы чаму лічыліся прагуламі.

Зьніжэньне накладных выдаткаў было прадугледжана прамфінпляном да 199278 р. а пры заключэньні дагавору гэта сума была зьніжана яшчэ на два процанты. Фактычны расход за трэці квартал складаў 144888 рублёў. Гэта дае магчымасьць спадзявацца, што к канцу гаспадарчага году зьніжэньне накладных выдаткаў будзе, нават, з некаторым перавышэньнем.

У дагаворы прадугледжвалася вырабіць штодзённа па 50,9 кілёграмаў дражджэй на аднаго рабочага. За трэці квартал выраблена 50,7 кілёграмаў; гэта дае магчымасьць спадзявацца, што пункт дагавору аб вытворчасьці працы будзе таксама выкананы.

У сучасны момант на заводзе „Чырвоная Зорка“ працуюць рабочыя брыгады па выяўленьні прычын невыкананьня некаторых пунктаў дагавору, а таксама правяраюць ці ўся праца заводу ахоплена сацыялістычным спаборніцтвам, што будзе прынята пад увагу пры перазаключэньні дагавору паміж вышэйказанымі заводамі 20 кастрычніка гэтага году.

Завод „Чырвоная Зорка“ выклікае па сацыялістычнае спаборніцтва і Ленінградзкі дражджавы завод.

Перазаключэньне дагавору паміж заводамі адбудзецца ў пісьмовай форме, каб зьменшыць лішнія накладныя выдаткі па паездках.

С.

КСМ у авангардзе.

(Бабруйшчына).

Бабруйшчыны ў справе ўзьняцьця вытворчасьці, зьніжэньня сабекошту, павялічэньня і палепшаньня прадукцыі, зьнішчэньня прагулаў дала ня дрэнныя вынікі. На фанерным заводзе зьмена дарослых рабочых выпрацавала за красавік м-ц 260 куб. мэтраў фанэры, а ўдарная зьмена моладзі 271 к-м. Па заводу павялічылася выпрацоўка прадукцыі. Красавік м-ц 541 к-м, а чэрвень м-ц 794 к-м. У агуле дае на 38,2 проц. павялічэньне. Павялічылася выпрацоўка экспартнай фанэры на 25 проц.

Па шклозаводу—Камінтэрн вытворная праграма па вырабу прадукцыі выканана на 110 проц., зьніжэньне сабекошту на 10,7 проц., а па праграме намечана было 5,7 проц. Маецца зьніжэньне браку ў першым і другім квартале ад 14-16 проц. Калі выраблялася бутылак паўлітровых 967 на аднаго рабочага ў першым квартале, то ў другім павялічана выпрацоўка да 1080 шт. Шэраг практычных прапаноў моладзі праходзіць у жыцьцё. На заводзе „Кастрычнік“ моладзьдзю ўнесена прапанова аб мэханізацыі кузьні, што дае каля 80 руб. эканоміі ў м-ц. На гэтым-жа заводзе ўдасканалена абразка лямп у перабочным цаху, што зьнізіла бой на 80 проц. Група рацыяналізатараў мэханізавала форму для лямп, што дае 4000 руб. эканоміі ў год.

Моладзь у Жлобіне на лесазаводзе дабілася, што завод стаў працаваць на дзьве зьмены, а гэта дасьць магчымасьць перайсьці на непрарыўны тыдзень працы. На чыгунцы былі складзены ўдар-брыгады сумесна з старымі рабочымі, у выніку павялічана прадукцыя на 5 проц.

Усе гэтыя вынікі паказваюць, што моладзь цікавіцца ўзьняцьцем вытворчасьці. Зараз у час правецкі дагавораў—КСМ павінен яшчэ больш узяцца за працу па разгортваньню сацспаборніцтва.

Андрэй Малады.

ПАЧАЛАСЯ ПРАВЕРКА ДАГАВОРАЎ.

(г. Віцебск).

На прадпрыёмствах Віцебшчыны пачалася праверка дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву. Працуе камісія ЦСПСБ пад старшынствам таварыша Плаўніка. Складзены брыгады, у якія ўцягнута да 150 чалавек.

Праведзены нарады—фабзавкомаў і рабкораў гораду.

Побач са значнымі дасягненьнямі, першыя дні праверкі кажуць аб тым, што рабочыя масы яшчэ слаба ўцягнуты у сацыялістычнае спаборніцтва. Профарганізацыі яшчэ працуюць старымі мэтадамі. Яны ніяк ня могуць узяць належны тэмп і адважыцца перайсьці на новыя формы работы.

Зусім слабы ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве прымае адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал. Культурна-масавая работа ніякага адбітку не знайшла ў сацыялістычным спаборніцтве. Вытворчыя камісіі і нарады недастаткова разгарнулі сваю працу. Слаба праводзілася растлумачальная праца сярод рабочых. У час праверкі будзе асабліва ўвага зьвернута на працу ўдарных брыгад.

Ул. Д—скі.

Напярэдадні праверкі сацыялістычнага спаборніцтва.

(ФАБРЫКА СПАРТАК, МАГІЛЕЎШЧЫНА)

На папяровай фабрыцы „Спартак“ сацыялістычнае спаборніцтва распачалося месяцы чатыры таму назад.

Гэтае пытаньне абгаварвалася ўсебакова на рабочых конфэрэнцыях і сходах. Апрача таго, праводзілася растлумачальная работа ў часы сьняданьня, сярод паасобных рабочых і работніц.

Трэба заўважыць, як недахоп, недастаткова-шчыры ўдзел інжынэрна-тэхнічных сіл у справе спаборніцтва. Гэта, бязумоўна, адбілася на агульным сходзе сацыялістычнага спаборніцтва на „Спартаку“.

Якая-ж задача ставілася рабочымі ў час складаньня дагавору з іншымі фабрыкамі і як гэтыя задачы ажыцьцяўляюцца?

Было пастаўлена задачай павялічэньне вырабу паперы на 25 проц. у параўнаньні з прамфінпляном, выканалі на 22,31 проц., вытворчасьць працы павялічылася на 25,8 проц., гаспадарчыя выдаткі зьнізіліся на 11,4 проц., брак зьменшыўся на 5,5 проц.

Ёсьць пэўныя вынікі ў зьмяншэньні прастою машын. На 7 проц. зьнізіўся сабекошт прадукцыі.

Надалей неабходна паставіць задачай падшуканьне лепшых шляхоў паляпшэньня і ўзмацненьня прадпрыемстваў. Спыняцца на дасягнутых посьпехах нельга. Трэба ўцягнуць у спаборніцтва ўсе пласты рабочых, служачых і тэхнічна-інжэнэрныя сілы фабрыкі. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на шырокую пастаноўку абмену вопытам паміж аднароднымі фабрыкамі. Гэта забясьпечыць значна лепшае выкананьне дагавораў.

Леванід Свой.

Дагаворы павінны быць выкананы.

(Барысаўшчына).

Дагаворы па сацыялістычнаму спаборніцтву заключылі: фэрма пры Стара-Барысаўскім сельска-гаспадарчым тэхнікуме, савгас „Весялова“, фабрыка „Рабочы“ і вёскі Быччанскага сельсавету. Ужо зараз можна канстатаваць, што некаторыя дасягненьні ёсьць.

Савгас „Весялова“ і фэрма свалчасова скопчылі і пачалі як вясновую, так і асеньнюю пасяўную кампанію. Прадукцыйнасьць працы ў савгасе „Весялова“ паднята на 15 пр. яшчэ ў вясновы час, а па фэрме 15 пр. у асеньні час. Значна павялічан ураджай у параўнаньні з мінулым годам. Вялікую дапамогу аказала фэрма і тэхнікум беднаце ў час пасяўных кампаній. Аказана дапамога ў час вясновай пасеўкампаніі 3 гаспадаркам і ў час асеньняй таксама тром. Абменяна насеньня сялянам вясной 1013 пуд. і восеньню 3581 п.

Пасяўная плошча павялічана ў савгасе „Весялова“ на 2 гэктары і на фэрме на 8 гэктараў.

Фабрыка „Рабочы“ падняла прадукцыйнасьць працы на 12 проц., па дагавору на 10 пр. Паменшаны брак на 15 проц., а трэба на 2 пр., паменшаны прастоі на 25 пр., па ўмове трэба на 50 пр.

Па вёсках Быччанскага с-с.: у в. Дубяні ліквідаваны часткова межы. Забаронена і выжыта пасьба жывёлы на сенажацях. У значнай колькасьці ўжываецца торф на ўгнаеньне.

Па сельсавету сабрана 500 пуд. попелу, хоць лічба малая, але першы пачатак ёсьць. У асеньнюю пасяўную кампанію жыта абчышчана на 70 пр. Увезена гатунковага насеньня на 95 пр. і абменена 224 пуд., арганізавана 2 мэліарацыйных т-вы і 1 малочнае. Сёлета лубіну пад жыта было заселена 111,35 гэктараў, павялічана плошча пасеваў на 10 гэктараў. У в. Студзенка ўжыт раньні пар.

Гэта ўсе дасягненьні, якія атрымалі пасьля заключэньня дагавораў. Поруч з дасягненьнямі ёсьць шмат і недахватоў. Фэрма пры с. г. тэхнікуме замест раньняга пару зрабіла позьні. Параніну аралі тады, калі трэба было сеяць жыта. Разам амаль і клалі мінэральныя ўгнаеньні. Па ўмове прадукцыйнасьць працы павінна была падняцца на 50 пр., пры гэтым неабходна было ўжыць зьдзельшчыну, але гэта ня зроблена і пункт дагавору выкананы толькі на 15 пр.

Не разгорнута праца Быччанскага і Студзенскага мэліарацыйных т-ваў. Насеньне па Быччанскаму сельсавету не ачышчана ўсё. Не пашырана плошча засеву кармавых траў, карня-плодаў і тэхнічных культур. Уборка культур на фэрме ідзе непадрыхтавана, вось чаму ўборку бульбы вышаў выбіраць амаль увесь тэхнікум, каля 100 чал., з 10 вёдрамі і за дзень выбралі толькі 500 п. Прадукцыйнасьць працы была зусім кепскаю.

Трэба адзначыць, што студэнцтва, нават комсамольскія арганізацыі, мала турбуюцца і ня чуюць за сабой адказнасьці па выкананьню дагавору спаборніцтва.

Трэба зараз-жа праверыць дагаворы спаборніцтва, абгаварыць недахваты і намеціць далейшы шлях ходу сацыялістычнага спаборніцтва.

М. Д

Сацыялістычнае спаборніцтва па загатоўках.

(Лупалаўскі раён, Магілеўскае акругі).

У Нічыпараўскім с.-савеце плянам было вызначана загатовіць 1867 пуд; 7 сялянскіх сходаў павялічылі гэту лічбу на 130 п. Па Яганаўскаму с-с. вызначана загатовіць 1654 п.; сялянскія сходы павялічылі гэту лічбу на 909 п. Вёска Даманы адхіліла пастанову вясковай камісіі, якая вызначала загатовіць 550 п. усіх культур, і пастанавіла павялічыць загатоўкі да 1199 п.

На праведзеных сходах беднота і серадняцтва аднадушна падтрымлівалі свае пастановы, ня гледзячы на выступленьні кулакоў і падкулачнікаў супроць вызначаных лічб і саміх загатовак.

Вёска Даманы на сваім агульным сходзе пастанавіла выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва 3 вёскі: Пудаўна, Гараны і Еганы з канкрэтнымі пунктамі: 1) За колькасьць і якасьць стварэньня чырвоных абозаў і здачы да вызначанага тэрміну лішкаў па загатоўкам; 2) Адбыць поўнасьцю дні па працпавіннасьці на якасьць правадзімых работ на дарогах і 3) За своечасовае і поўнае выкананьне ўсіх відаў грашовых падаткаў.

Падарожны.

Дзень ураджаю і калектывізацыі даў новыя дзесяткі калгасаў.

Цэлыя вёскі ў калгасы.

ВОРША, 15-X. Не чакаючы „Дню калектывізацыі і ўраджаю“, сяляне Мсьціслаўскага раёну арганізуюць буйныя калгасы і ідуць у іх цэлымі вёскамі. Гэтымі днямі ў Рылаўшчынскім сельсавеце арганізаваўся новы буйны—першы па буйнасьці на Аршаншчыне—калгас на плошчы ў 2.500 гэктараў. У яго ўвайшло шэсьць вёсак у складзе 110 двароў. У Рылаўшчынскім сельсавеце гэта ўжо ў гэтым годзе арганізаваўся другі буйны калгас. Першы арганізаваны сялянамі вёскі Парадзіна на плошчы да 1000 га. Вось гэты першы буйны калгас, які добра распачаў працу, і зьявіўся натхненьнем да арганізацыі новага буйнага калгасу.

Заклікаюць пасьледаваць іх прыкладу

Віцебск, 15-X. *У Высачанскім раёне арганізавалася камуна „Страх Врагам“ на плошчы 737 гэктараў, у якую ўвайшло 44 сямействы з 180 ядакамі. Камунары заклікаюць усіх батракаў, беднякоў і сераднякоў пасьледваць іх прыкладу.*

Арганізуюцца 2 трактарныя калёны.

Віцебск, 15-X. На Віцебшчыне арганізуюцца дзьве трактарныя калёны—адна ў Гарадоцкім раёне, другая—у Сіроцінскім. Пры АВК будзе ўтворан фонд арганізацыі калён, у які паступяць сродкі ад дабраахвотных адлічэньняў, адпрацовак і г. д.

Акруговае праўленьне т-ва «Культэмыч ка“ ўжо разгортвае працу па арганізацыі трактарнай калёны „Рабочы шэф“. У фонд арганізацыі калёны праўленьнем адлічана 3000 рублёў.

У сувязі з „Днем ураджаю і калектывізацыі“ рабкоры Віцебшчыны пачалі збор сродкаў на пабудову трактара імя газэты „Віцебскі Пралетары“.

Першая тысяча.

Хутары ператвараюцца ў калгасы.

Магілеў, 15-X. Калектывізацыя зьнішчае хутары як сталыпінскія, гэтак і прышчэпаўскія.

У мінулым годзе ў Магілеўскі акрузе спыніўся рост хутароў.

А сёлета мы маем ужо іх памяншэньне. Першая тысяча хутароў ужо спыніла сваё існаваньне. Пры гэтым толькі некалькі іх дзесяткаў увайшлі ў пасёлкі, а рэшта—аб'ядналіся ў калгасы.

На першым месцы па зьнішчэньні хутароў стаіць, як і належыла чакаць, Клімаўшчына. Але не на многа адстаюць і гэткія „хутарскія“ раёны, як Лупалаўшчына і Магілеўшчына. Наогул, няма раёну, дзе-б калі ня некалькі дзесяткаў, дык некалькі адзінак хутароў не адмовіліся ад індывідуальнае формы землякарыстаньня.

Зараз ёсьць ужо шмат калгасаў, якія складаюцца выключна з хутароў.

Такія калгасы складзены ў Глупіках 353 хутары і ў Цяжарах на плошчы 500 гэк.

У Латрошчы латышы-хутаране зьнішчылі межы і зараз маюць калгас у 325 гэктараў. У калгасе „Гігант“, гісторыя з якім абышла ўсе менскія газэты, зараз налічваецца 60 сямей з былых хутароў.

Хутары „здаюцца“. І калі ў першы год мы іх зьнішчылі тысячу штук, дык далейшы працэс пойдзе хутчэй.

К-и.

10 сельсаветаў будуць поўнасьцю калектывізаваны.

(Ад нашага бабруйскага нарэспандэнта).

Шпаркі рост калектывізацыі на акрузе, які асабліва выявіўся ў бягучым годзе, прымусіў належныя органы належным чынам пераглядзець свае пляны калектывізацыі на наступны год і перапрацаваць іх так, каб яны маглі ахапіць поўнасьцю тэмп калектывізацыі.

Выходзячы з гэтага, на наступны год на Бабруйшчыне мяркуецца калектывізаваць 100 тысяч гэктараў зямельнай плошчы. Гэтая лічба ў два з паловаю разы перавысіць маючуюся ў сучасны момант лічбу зямельнай плошчы, занятай пад калгасы.

Вызначэньне такой буйнай лічбы па калектывізацыі паставіла перад партыйнымі і савецкім органамі задачу перавесьці частку працы па калектывізацыі на рэйкі масавай калектывізацыі ў асобных раёнах акругі. Для правядзеньня ў жыцьцё такога мерапрыёмства вызначаны чатыры раёны: Рагачэўскі, Жлобінскі, Старобінскі і Чырвона-Слабодзкі. Раёны вывучаюць гэта пытаньне, а Рагачэўскі раён ужо прыступіў да практычнага ажыцьцяўленьня мерапрыёмстваў па пераводу цэлых сельсаветаў і шэрагу сельсаветаў на калектыўн. працу.

Рагачэўскі раён мае ў сучасны момант 34 калгасы, якія займаюць 9 тысяч гэктараў. Асабліва шырокім разгортваньнем калектыўнага будаўніцтва вызначецца Гарадзецка-Сьвержанскі падраён. Ён аб'яднае сабою 10 сельсаветаў і на сёньнешні дзень мае калектывізаванага сялянства 50 проц., прычым па асобных сельсаветах процант калектывізаванага сялянства даходзіць да 40-50 проц. З агульнай сумы 9 тысяч гэктараў зямлі, якія маюць калгасы, 7 тысяч прыпадае якраз на гэты самы падраён.

Апрача вялікага процанту калектывізаваных двароў, гэты падраён мае амаль што ў кожнай вёсцы групу прыхільнікаў калгасаў, якія хоць сёньня гатовы ісьці ў калгас. Побач з гэтым, падраён мае буйны калгас, які арганізаваўся з хутароў і налічвае ў сабе звыш ста сямей. Ёсьць тут таксама цэлы шэраг (каля дзесятку) буйных калгасаў ад 40 да 70 сямей.

У падраёне працуе 5 партыйных і 8 камсамольскіх ячэек, ёсьць два саўгасы, 2 крэдытных таварыствы, 2 сямігодкі, бальніца і г. д.

Па свайму месцазнаходжаньню гэты падраён масавай калектывізацыі стаіць поплеч з Жлобінскім раёнам, якраз з тою часткаю яго, якая мае шырока разгорнутую сыстэму буйных калгасаў (калгас „Расьсьвет“—112 сямей) і г. д.

Выходзячы з гэтага становішча, Рагачэўскі райвыканком вылучыў падраён для правядзеньня ў ім поўнай калектывізацыі.

Пачата практычная праца па ажыцьцяўленьню гэтай пастановы. У раёне створана спэцыяльная брыгада з адказных прадстаўнікоў па кіраўніцтву працаю па калектывізацыі раёну. На дапамогу брыгадзе райвыканком пасылае аграномаў, зьняўшы іх з вучасткаў і прымацаваўшы да раёну поўнай калектывізацыі.

Праца па поўнай калектывізацыі гэтага раёну будзе скончана роўна праз год. У асяродку калектывізаванага раёну будзе арганізавана трактарная станцыя.

Гэты раён зьявіцца першым раёнам поўнай калектывізацыі, заняўшы сабою 47 тысяч гэктараў зямлі.

А. Дамброўскі.

Масавая калектывізацыя.

Калгасны рух па Віцебшчыне разгортваецца. Растуць новыя калгасы. Раней арганізаваныя дробныя калгасы зараз аб'яднаюцца ў буйныя. Арганізацыі калгасаў і іх узмацненьню дапамагаюць рабочыя шэфскія арганізацыі і рабочыя брыгады.

Рабочыя фабрыкі «Дзьвіна» дапамаглі арганізаваць 2 калгасы.

У вёсцы Лоўжа, Сіроцінскага раёну, арганізован калгас „Перамога“ на плошчы ў 260 гэктараў, які аб'яднаў 19 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У Лёзьнянскім раёне арганізаваўся буйны калгас **«Чырвоная Зорка»**, які аб'яднае 22 вёскі з 300 хутарскімі гаспадаркамі на плошчы ў 2890 гэктараў. Кулакі, папы і былыя паліцэйскія, якіх на тэрыторыі калгасу мелася 75 чалавек, вядуць зараз шалёную барацьбу супроць калгасу.

Ул. Д—скі.

Прафсаюзы—шэфы над калгасамі.

Магілеў, 15-X. Спэцыяльная нарада старшынь акрпрафсаюзаў ухваліла прыняць шэфства над калгасамі.

14 саюзаў бяруць шэфства над 14 бліжэйшымі да Магілева калгасамі Магілеўскага, Лупалаўскага і Шклоўскага райёнаў.

12 і 13 кастрычніка на сходах рабочых і служачых прадстаўнікі калгасаў, над якімі бяруцца шэфства, рабілі даклады аб становішчы сваіх калгасаў.

У „Дзень калектывізацыі“ рабочыя брыгады выехалі ў калгасы і бліжэйшыя вёскі, каб разам правесьці сьвята і азнаёміцца з калгасамі, дапамагчы іх узбуйненьню за кошт вакольнага насельніцтва і наогул пакласьці пачатак далейшай рабочай дапамогі вёсцы.

14 новых буйных калгасаў.

Клімавічы, 15-X. (Па тэлеграфу ад нашага кар.) „Дзень калектывізацыі і ўраджаю“ даў на Клімаўшчыне 14 новых волатаў-калгасаў. Плошча гэтых калгасаў займае каля 15 тысяч гэктараў. Зараз райён калектывізаваны на 30 проц.

Старыя калгасы ў пацвядзелак—Пакрова пастарому і „Дзень калектывізацыі і ўраджаю“ па новаму—праводзілі пасадку садоў; у «Бальшавіку» засаджана дрэўцамі яблынь 8 гэктараў, а ў „Ленінскім шляху“—10 гэктараў. Апроч гэтага, калгасы і бядняцка-серадняцкая частка вёскі здалі ў гэты дзень чырвонымі абозамі 14 тысяч пудоў хлеба (плян хлебазагатовак на Клімаўшчыне выканан на 88 проц.).

Два сельсаветы на суцэльную калектывізацыю.

Копысь, Арш. акругі, 15-X. Райвыканком прыняў пастанову аб правядзеньні суцэльнай калектывізацыі ў Зубаўскім і Малакоўскім сельсаветах. Для наладжваньня падрыхтоўчай працы Райком партыі ў Зубаўскі і Маслакоўскі сельсаветы мабілізаваў групу партыйцаў калектыву завода «Пралетары“. Апроч гэтага туды выехала група рабочых зав. „Пралетары“ і фабрыкі „Якаўлевіцкая манафактура“.

М. Гурэвіч.

Растлумачым выгады калектывізацыі.

(Зеляноцкі с-с. Калінкавіцкага р., Мазырскай акр.).

Выезд для правядзеньня пасяджэньня ў вёсцы Даманавічы прэзыдыуму Мазырскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ўскалыхнуў сялянства Даманавіцкага і Зеляноцкага сельсаветаў. Даманавіцкі сельскі савет ужо пераходзіць на сплошную калектывізацыю.

Сялянства, асабліва беднота і серадняцтва Зеляноцкага сельсавету пагаварвае адносна, таксама, поўнага пераходу на калгаснае жыцьцё.

Улічваючы цягу сялянства да ломкі старога сталыпінска - прышчэпаўскага хутара і пабудовы буйных калгасаў, зеляноцкая парт'ячэйка парашыла правесьці шырокую растлумачальную працу па ўсхі хутарох адносна калектывізацыі.

— Ні адзін хутар не павінен застацца ў наведаньні выгады калектывізацыі—так сказалі камуністы Зеляноцкай парт'ячэйкі.

Ужо зараз праводзяцца сходы беднаты па вёсках і хутарох, дзе асноўным пытаньнем стаіць пытаньне „Дню ўраджаю і калектывізацыі“.

— Памрэ вясною сталыпінска-прышчэпаўскі хутар,—кажуць сяляне.

— Загудзіць на гарочыцкіх палетках трактар,—падказуюць другія.

Падрыхтоўка да правядзеньня „Дню калектывізацыі і ўраджайнасьці“ ідзе поўным ходам, і трэба спадзявацца, што дасьць належныя вынікі.

Вас. Дубовы.

С. КУЗЬНЯЦОЎ

Пераход на „бесперарыўку“— справа вялікай палітычнай важнасьці.

Палітыка-эканамічнае значэньне бесперапыннай вытворчасьці непасрэдна выцякае з устаноўкі, якая дадзена лістападаўскім пленумам. У адпаведнасьці з дырэктывамі XV зьезду партыі лістападаўскі пленум даў дакладную і ясную ўстаноўку на пытаньнях разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва і тэмпаў індустрыялізацыі краіны і перабудовы сельскае гаспадаркі.

Пераход на бесперапынную вытворчасьць зьяўляецца адным са сродкаў паскораньня тэмпаў разьвіцьця індустрыі і правядзеньня глыбокіх рацыянальных мерапрыёмстваў у прамысловасьці.

Пераход на бесперапынную вытворчасьць дае павялічэньне прадукцыйнай эксплёатацыі асноўнага капіталу нашай прамысловасьці, магчымасьць пашырэньня вытворчасьці без капітальных укладаньняў. Перавод работы прадпрыёмства на 7 дзён у тыдзень замест існуючых зараз 6 дае наогул павялічэньне рабочага часу, і ў адпаведнасьці з гэтым,—рост колькасьці рабочых, а значыцца, і рост выпускаемай прадукцыі.

Рост выпускаемай прадукцыі, у сваю чаргу, даючы рост прамысловай прадукцыі, дае ў канчатковым выніку павялічэньне накапленьняў у прамысловасьці. Значна палягчаецца вырашэньне задач зьніжэньня сабекошту па лініі больш хуткай амартызацыі будынкаў і машын. Палягчаецца правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, таму што вострасьць пытаньня аб скарачэньні рабочай сілы ў моц рацыяналізацыі ў значнай ступені адпадае. А ў сучасны момант лішка рабочай сілы ў тэкстыльнай, напрыклад, прамысловасьці служыцьпрычынай, якая перашкаджае правядзеньню рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Падругое, у большай ступені зьявіцца магчымасьць правядзеньня канцэнтрацыі прадпрыёмстваў, паколькі ў цэлым шэраргу галін маларэнтабельныя прадпрыёмствы могуць быць зачынены, і рабочыя з іх пераведзены на больш рэнтабельныя прадпрыёмствы.

Уцягненьне новай рабочай сілы ў вытворчасьць ставіць задачу пашырэньня кадраў кваліфікаванай рабочай сілы і адчыняе шырокі шлях для вытворчага вылучэньня. Завастраецца задача шырокага разгортваньня масавай прафтэхнічнай адукацыі.

Нарэшце, прыняты ўрадам варыянт пяцідзённага рабочага тыдню забясьпечвае больш раўнамернае чаргаваньне дзён адпачынку і працы. Гэта забясьпечвае лепшы адпачынак, значна павялічыць прадукцыйнасьць працы, будзе дапамагаць росту зарплаты і палепшаньню агульнага матар'яльна-бытавога становішча рабочых прадпрыёмстваў, якія перайшлі на бесперапынную вытворчасьць.

Пераходзячы на бесперапынную вытворчасьць, мы робім значны крок да ламаньня бытавых навыкаў, якія засталіся ў нас ад старой грамады.

На 12-м годзе рэвалюцыі і рабочыя і ўсё вытворчае абсталяваньне, прызначанае для вытворчай эксплёатацыі, працягвае адпачываць у дні царкоўных сьвятаў. Буржуазія замацавала выгодны ёй рэлігійны дурман днямі адпачынку ў вытворчасьці. Зусім відавочна, што перавод прадпрыёмстваў на бесперапынную вытворчасьць сустрэне супраціўленьне кансэрватыўных і рэакцыйных элемэнтаў як сярод служачых, паасобных груп тэхнічнага пэрсаналу, так і сярод адсталых пластоў рабочых і работніц. Гэта супраціўленьне паспрабуюць выкарыстаць у сваіх мэтах і рэшткі трацкістаў. Супраціўленьне адсталых рабочых у шэрагу выпадкаў адаб'е і права-апартуністычныя элемэнты, якія падпадаюць хвасьцісцкім настроям.

Для перамогі гэтага супраціўленьня і кансэрватызму трэба з самага пачатку добра паставіць растлумачальную працу, мабілізаваўшы для яе сілы партыйных і камсамольскіх арганізацый і перадавога актыву з беспартыйных рабочых, работніц і маладзі. Вялікую працу ў гэтым кірунку павінна разгарнуць таварыства „Бязбожнік“.

Ня трэба, вядома, думаць, што пераход на бесперапынную вытворчасьць ахопіць адразу ўсю прамысловасьць, і мы здолеем яго ажыцьцёвіць у бягучым-жа гаспадарчым годзе.

Пастанова ўраду прадугледжвае паступовасьць гэтага пераходу.

Самым небясьпечным у гэтай справе была-б падрыхтоўка габінэтным парадкам у заводакіраўніцтвах. Патрэбна перш-на-перш пастаноўка пытаньня на агульных сходах рабочых, а пасьля ўжо супольна з усімі заводзкімі арганізацыямі, інжэнэрна-тэхнічнымі сэкцыямі і г. д.,—усебаковая прапрацоўка пляну пераводу прадпрыёмства.

Другой небясьпекай тут можа быць адсутнасьць **папярэдняга** прыстасаваньня да ўмоў бесперапыннай вытворчасьці работы каапэратыву, сталовак, буфэтаў, мэдыцынскіх пунктаў, рабочых цягнікоў, трамваяў, клюбаў і іншых культурных установаў.

Прыстасаваньне работы гэтых арганізацый павінна ўваходзіць **арганічнай складанаю часткаю** ў плян пераходу на бесперапынную вытворчасьць кожнага паасобнага прадпрыёмства.

Прыстасаваньне да ўмоў бесперапыннай вытворчасьці абслугоўваньня культурна-бытавых патрэб вымагае новых сродкаў і новых кадраў. Дзяржпляну, НКАсьветы, НК Аховы Здароўя, Цэнтрасаюзу, УсеЦСПС ужо цяпер, пры распрацоўцы пяцігодкі, трэба паклапаціцца аб адшуканьні сродкаў і прапрацоўцы мерапрыёмстваў для пашырэньня і падрыхтоўкі кадраў.

Вялікай важнасьці задачы стаяць у справе падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Найперш трэба безадкладна прыступіць да пашырэньня сеткі прафтэхнічнай адукацыі — пашырыць ахоп фабзавучам, сеткаю прафтэхнічных курсаў ЦІП і інш.

Патрабуецца арганізацыя кароткатэрміновых курсаў і выпуск масавай тэхнічнай літаратуры.

Тут высоўваецца праблема, якою павінен заняцца НКАсьветы, узмацненьня і паскораньня падрыхтоўкі інжынэрна-тэхнічных кадраў і прыстасаваньня вытворчай практыкі студэнтаў старшых курсаў да здавальненьня патрэб у тэхнічным пэрсанале на прадпрыёмстве.

Пераход на бесперапынную вытворчасьць патрабуе рашучай перабудовы мэтадаў і тэмпаў масавай партыйнай, прафсаюзнай, культурнай работы і работы дабраахвотных таварыстваў, прыстасаваньня яе да чаргаваньня дзён адпачынку, да зьмен груп рабочых і г. д.

Трэба адзначыць у гэтай адносіне наліччa кансэрватызму ў партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях. Але і зараз існуе шэраг галін, дзе вядзецца бесперапынная работа (буйныя новыя пабудовы, апал, хімічная прамысловасьць і інш.)

Калі праверыць вопыт гэтай работы, дык аказваецца, што вопыт ня ўлічая. У шэрагу месц зьменная работа, асабліва ў начных зьменах, не абслугоўваецца партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі.

Праведзенае АППА ЦК азнаямленьне з кіраўніцтвам і падрыхтоўкай да пераводу на бесперапынную вытворчасьць у культадзелах цэнтральных органаў саюзаў (хімікаў, горнарабочых, будаўнікоў і шэрагу іншых) выявіла поўную непадрыхтаванасьць і замяшаньне, адсутнасьць якога-небудзь вучоту вопыту прадпрыёмстваў, якія ўжо доўгі час маюць бесперапынную вытворчасьць. Гэта гаворыць аб шаблёне ў кіраўніцтве і пяздольнасьці адначасова прыстасоўваць работу да новых умоў і задач.

Нам зараз больш, чым калі-небудзь, патрэбна ўважлівае вывучэньне вопыту і ўважлівае прыстасаваньне ўсёй масавай работы да ўмоў вытворчасьці.

Пры ўмове правільнага чаргаваньня зьменных груп у бесперапыннай вытворчасьці да іх трэба дапасоўваць зьменныя агульназаводзкія, цэхавыя, групавыя сходы і сетку партыйнай асьветы. Гэта патрабуе дадатковых сіл для абслугоўваньня.

Партыйным камітэтам, ячэйкам і прафорганам трэба было-б пашырыць кадры арганізатараў-дакладчыкаў, прапагандыстаў, кіраўнікоў гурткоў, экскурсій і г. д. Трэба своечасова падрыхтаваць людзей праз адпаведныя сэмінарыі, гурткі і інш.

Пераход на пяціднёўку патрабуе дакладнай прапрацоўкі календара ўсіх заняткаў. Асноўнай адзінкай часу павінна стаць дэкада (дзесяціднёўка) замест тыдню. Усялякія пасяджэньні, заняткі гурткоў, сходы і г. д., замест аднаго разу ў тыдзень, трэба праводзіць адзін раз у дзесяць дзён.

Гэта ў значнай ступені разгрузіць ад непатрэбнай «заседательской суетни“ і дасьць шэраг лішніх вечароў для выхаваўчай работы, самаадукацыі і адпачынку.

Бязумоўна, на прадпрыёмствах пры складаньні зьмен і груп па днёх адпачынку трэба ўлічваць сямейныя ўмовы, забясьпечваючы па магчымасьці атрыманьне адпачынку членамі сям'і ў адзін дзень.

Бесперапынны тыдзень з раўнамерным чаргаваньнем дзён адпачынку і раўнамерным размеркаваньнем рабочых па днёх адпачынку створыць умовы для рацыяналізацыі культурнага адпачынку і забаў.

Ва ўсёй рабоце, якая зьвязана з пераходам на бесперапынную вытворчасьць, выключна важнае значэньне набывае абмен вопытам

У БАЁХ ЗА БЕЛАРУСКУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ КУЛЬТУРУ.

Праводзячы беларусізацыю, узьнімаючы яе якасьць, будзем біць па вялікадзяржаўнаму шавінізму, будзем бязьлітасна змагацца з усялякімі праявамі нацыянал-дэмакратызму.

ЗАРАЗ ПАТРЭБНА ЯШЧЭ З БОЛЬШАЙ СІЛАЙ УЗЯЦЦА ЗА СПРАВУ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ, РАШУЧА ЗМАГАЮЧЫСЯ З УСЯКІМ АДКРЫТЫМ І СКРЫТЫМ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕМ ЛІНІІ ПАРТЫІ Ў ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ.

Гамарнік.

Яшчэ больш узмоцненым тэмпам праводзіць беларусізацыю ў партарганізацыях, савецкім апараце, прафсаюзах, разьвіваць усямерна беларускую культуру, забясьпечваючы ёй пралетарскі зьмест, і разьвіваць самую шырокую і настойлівую штодзённую прапаганду сярод шырокіх рабочых мас за беларусізацыю, за ўладаньне і поўнае кіраўніцтва беларускай культурай, якая разьвіваецца, як адного з буйнейшых сродкаў узмацненьня кіраўніцтва вёскай з боку рабочае клясы.

XII зъезд КП(б)Б.

ЗАРАЗ ТРЭБА СТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ ТЫМ, КАБ БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ БЫЛА НЯ МОДАЙ, НЕ НАДВОРНА ПАКАЗНЫМ БОКАМ, НЯ ШЫЛЬДАЙ, ТРЭБА, КАБ ЯНА ЎВАЙШЛА Ў БЫТ, У КУЛЬТУРУ.

Кнорын.

За шыльдамі.

ТЭОРЫЯ АКАДЭМІКА ПАЎЛАВА АБ РЭФЛЕКСАХ І... БЕЛАРУСКАЯ МОВА.

Чытач адчувае ўжо сабе ілёмка, ужо на твары прабеглі маршчынкі зьдзіўленьня, чытач адразу хоча запытаць:

— Прычым тут тэорыя акадэміка Паўлава аб рэфлексах і беларуская мова?

Чытач хвалюецца.

— Дайце хутчэй адказ. Што за інтрыга?

Тлумачэньне ўсёй гэтай інтрызе даць можам хоць і зараз, але вось наконт зьдзіўленьня тут мы ня ручаемся.

Але тымчасам бліжэй да справы.

Мне здаралася быць у некаторых гэтак званых камэрах рэфлексаў, у якіх абсталяваньне і работа вядзецца на мэтаду акадэміка Паўлава. На спэцыяльных варштатах, так званых станках, стаіць падвязаная сабака. Лябарант, не шкадуючы воцату ці іншых кіслот, улівае іх сабаці ў рот, і ў гэты самы час тут жа звоніць званок. Сабака пішчыць, рвецца, кідаецца на чалавека і брэша. Так паўтараецца некалькі разоў, і пасьля лябарант ставіцца з боку, ніякімі кіслотамі сабаку не частуе, але звоніць толькі званок, і эфэкт атрымліваецца такі-ж самы. Сабака пішчыць, рвецца, кідаецца на чалавека і брэша. Зразумела, што ў сабакі ўжо выпрацаваўся ўмоўны рэфлекс адмоўнага парадку. Калі-ж карміць сабаку мясам і грань у дудачку, дык атрымоўваецца станоўчы рэфлекс. Пры паўторнай ігры на дудачцы сабака будзе лашчыцца, адкрываць рот, і ў сабакі будзе выцякаць сьліна.

Ад гэтага тлумачэньня зьдзіўленьне не праходзіць. Чытач зноў думае:

— А якія адносіны гэта мае да беларускае мовы?

Цяпер ужо можна сказаць і пра беларускую мову. Трэба, бачыце, усё па-парадку.

Адзін доктар на Мазыршчыне, карыстаючыся памянёным мэтадам акадэміка Паўлава, прышчапіў сваёй сабацы такі рэфлекс, што калі хто з доктарам загаворыць па-беларуску, дык сабака пачынае брахаць і кідаецца на яго.

Атрымліваецца прыблізна вось так:

Хворы заходзіць да доктара і кажа:

— Прастудзіўся вельмі, прадула, мабыць, горла баліць, галава.

— Г-г-р-ы.

— Што параіце рабіць.

— Гаў—гаў!—кідаецца сабака.

Хворы зьбянтэжаны.

Доктар патроху з усьмешкай, адпіхаючы сабаку, пытае?

— Чем могу служить? На што жалуетесь?

— Горла вельмі баліць, нос заложыла, гаварыць ледзь магу.

— Г-гр-ы-ы... гаў—гаў!—і за штаніну.

Нарэшце, хворы выбіраецца з доктарскага пакою; хворы зьдзіўлены, зьбянтэжаны.

А праз няшчыльна зачыненыя дзьверы чуецца сабачы вой і лёгкае чалавечае:

— Ха-ха—ох-хо-хо!!!

Ня будзем удавацца ў дэталі, ня будзем праглядаць тыя мэтады, якімі карыстаўся гэты доктар пры навучаньні сваёй сабакі, але адзначым толькі, што такі факт быў, што такая сабака існавала і мо' кідаецца на ўсіх тых, хто гаворыць па-беларуску і цяпер, што гэты доктар жыве «здравствует» да гэтай пары і будзе жыць і „здравствовать", мабыць, да тае пары, пакуль той-жа самы собака ад такой навукі свайго гаспадара не звар'яцее і ня ўкусіць свайго „адукаванага" «господина».

ЛЯ ПАНСКАЙ БРАМЫ.

А ў сувязі з гэтым мне прыпомніўся і такі малюнак яшчэ з дарэвалюцыйнага часу.

Да панскага маёнтку падыходзіць селянін-бядняк. Апошні ішоў павольна, нібы ня хочучы, нібы хто цягнуў яго сілаю, а ён упіраўся і праз дзесятак крокаў троха спыніўся, прыглядаўся, правяраў нешта—ці тое свае думкі, ці дарогу. Але дарогу ён ведаў, і трэба лічыць, што правяраў ён свае думкі.

Ці варта ісьці да пана?

Але вось і брама. Не пасьпеў ён адумацца, як выскачыла зграя панскіх сабак і кінулася на бедняка, і каб ня кій, дык справа дайшла-б да сабачай расправы.

І калі праз некалькі хвілін высунулася з-за брамы постаць панскага паслугача, дык першымі словамі яго была сярдзітая лаянка.

— Навошта б'еш сабак?! Іш, знайшоўся! Гэта табе ня вашыя Рабчыкі ці Жучкі, гэта панскія!

Няруш, кажу! Вон!

Так і пайшоў той бядняк ні з чым, нават кій, які быў верным памоцнікам у дарозе, і той застаўся ў зубах якогась „Дэдзі" ці „Стэлы".

А праз якія паўгадзіны да гэтага-ж маёнтку пад'ехаў якісьці пан з суседняга маёнтку. Зноў выскачылі тыя-ж сабакі, але цяпер яны лашчыліся, падскаквалі, лізалі рукі. І ўсё гэта, ня гледзячы на тое, што гэты пан вітаўся з прышоўшымі спатыкаць яго гаспадарамі на беларускай мове.

ПРА ТЫХ, ХТО „ОРГАНИЧЕСКИ НЕ ПЕРЕВАРЫВАЕТ".

Зразумела, што справа ў памянёных выпадках не ў сабаках, нават больш таго, справа ня ў мове, а справа менавіта ў клясавым падыходзе і доктарачыноўніка „господина" і абшарніка—пана да варожых ім людзей, да варожых, менавіта, не па мове, а па сацыяльнай розьніцы. Сваім сабакам яны прывілі адмоўныя рэфлексы да ўсякіх праяў беларускае мовы, да мовы бедняка-селяніна, да мовы, якая ўжо ў значнай меры зьяўляецца моваю і рабочых Беларусі.

Гэтыя два абразкі (даўнасьць аднаго з іх мае толькі 2 гады) успомніліся сёньня таму, што і цяпер яшчэ, ня гледзячы на дзесяткі пастаноў партыі і ўраду аб беларусізацыі, апошняя шмат кім і шмат дзе праводзіцца яшчэ ня ў поўнай меры і праводзіцца недастаткова правільна. Некаторым здаецца, што гэта асобнае, «самодовлеющее» пытаньне і не разумеюць таго, што пытаньне беларусізацыі ёсьць агульнаклясавае пытаньне, зьяўляецца вялікім пунктам у вырашэньні нацыянальнага пытаньня ў прыватнасьці.

І таму тыя, хто зрывае беларусізацыю, хто шкодзіць беларусізацыі, хто ў кожным выпадку аказвае актыўнае ці нават пасыўнае супрацўленьне беларусізацыі, таго ў той ці іншай меры можна аднесьці і да людзей тыпу мазырскага доктара-чыноўніка і да тыпу абшарніка-пана, якія нацкоўвалі сваіх сабак на беларускага батрака і селяніна-серадняка (у такой-жа меры яны нацкоўвалі сваіх сабак і на яўрэя-бедняка і на расійца-рабочага). Чым іншым, як не такімі вось „барскімі" адносінамі да беларусізацыі можна назваць заяву галоўнага інжынэра Папертрэсту, які сказаў:

„Я органически не перевариваю белорусского языка".

Як можна зразумець такія абывательскія адносіны да беларускай мовы? Ня інакш, як нежаданьнем праводзіць беларусізацыю. Мы ў даным выпадку ня робім закідаў, што памянёны інжынэр Бумбэрг і супроць беларускіх рабочых і сялян, але-ж дазвольце нам сумявацца ў тым, што гэты інжынэр мае ў адносінах да іх добрыя намеры.

НІКОЛІ НЕ ПАСЛАБЛЯЛАСЯ ЎВАГА.

Як для ўсяе ЎсеКП(б), так і для КП(б)Б нацыянальнае пытаньне заўсёды зьяўлялася і зьяўляецца клясавым пытаньнем. У дарэвалюцыйныя часы нацыянальнае пытаньне было пытаньнем усяе сацыяльнае рэвалюцыі. У наш час нацыянальнае пытаньне зьяўляецца пытаньнем дыктатуры пралетарыяту. Беларусізацыя-ж зьяўляецца адным з момантаў нацыянальнае праблемы ў Беларусі і вырашаецца яно разам з пытаньнямі: яўрэйскім, польскім, літоўскім і латыскім. Пад такім пунктам погляду і даваліся ўсе дырэктывы партыі і ўраду ў галіне правядзеньня беларусізацыі. КП(б)Б ніколі не паслабляла ўвагі да гэтага пытаньня—змагаючыся з шавінізмам расійскім ці нацыяналізмам польскім і яўрэйскім, ці з нацыяналізмам беларускім. Партыя накіроўвала заўсёды ўвагу савецкае грамадзкасьці да справы беларусізацыі. Цяпер, у пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы ў нашай краіне, у пэрыяд нашага наступу на капіталістычныя элемэнты гораду, у пэрыяд шырокага наступу на кулака і нэпмана мы сустракаем контр-выступленьні гэтых элемэнтаў, якія вельмі часта вылёваюцца ў нацыянальную форму і маскіруюцца ёю. Выступленьні беларускіх нацыянал-дэмакратаў у апошні час занялі асабліва вялікае месца. Праўда, уся савецкая грамадзкасьць дала ім належны адпор, але трэба таксама памятаць і аб тым, што больш поўнае вырашэньне нашай нацпалітыкі, правядзеньне беларусізацыі, у прыватнасьці, зьяўляецца таксама аружжам, якое мы скарыстоўваем супроць нацдэмакратаў. А таму так важна цяпер няўхільнае і поўнае выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб беларусізацыі.

У гэтай галіне Савецкая Беларусь ужо мае значныя і значныя дасягненьні. Нашы вышэйшыя, сярэднія і нізэйшыя школы беларусізаваны, савецкі апарат у большасьці перайшоў на беларускую мову, нашыя кадры гавораць усё больш і больш пабеларуску. Больш таго, мы маем дасягненьні і на фронце беларускай пралетарскай культуры наогул: утварэньне БелАПП'у, Беларускай Акадэміі Навук, пашырэньне выданьня кніжак, газэт, пашырэньне тэатраў і палепшаньне іх работы.

НЕ ПАСЛАБЛЯЦЬ БАРАЦЬБЫ НА ДВА ФРОНТЫ.

Відавочна, што на гэтым фронце мы навялі шырокі наступ і маем дасканалыя вынікі, якія не даюць спакойна спаць нашым ворагам, і апошнія ўзьнімаюць сустрэчныя контратакі супроць нашае палітыкі як ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва, так і асабліва ў галіне нацыянальнага будаўніцтва. Нацыянал-дэмакраты некалькі разоў і нават праз наш савецкі друк (заява трох пісьменьнікаў і інш.) рабілі спробу абвінаваціць у недастатковай увазе да беларусізацыі. Але з гэтых выступленьняў нацдэмакратаў было ясна відаць, што яны не задаволены курсам партыі менавіта на пралетарскае разьвязваньне нацпытаньня. Яны мелі на ўвазе разам з беларусізацыяй працягнуць беларускую буржуазную культуру. Гэта ім не ўдалося, і таму плывуць пагалоскі аб няпоўнай беларусізацыі, аб малой увазе, аб затрымліваньні беларусізацыі. Яны „прашчыталіся", яны не даўлічылі таго (чаго часта не даўлічваюць і нашы работнікі), што беларусізацыя зьяўляецца шляхам да аўладаньня беларускай пралетарскай культуры рабочае клясы нашага краю. Нацыянал-дэмакраты, трэба адкрыта сказаць, хацелі скарыстаць беларусізацыю ў сваіх інтарэсах, таму яны спачатку былі прыхільнымі гледачамі ў гэтай справе. Нават больш таго—яны выкарыстоўвалі беларусізацыю для таго, каб у беларускай форме паднесьці нашай грамадзкасьці буржуазны, контррэвалюцыйны зьмест. Але хутка на гэтай справе яны апалілі свае буржуазныя крыльцы. Партыя і ўся савецкая грамадкасьць дала ім належны адпор.

Тады нацыянал-дэмакраты станавяцца ў апазіцыю і крычаць аб тым, што ніякай беларусізацыі не праводзіцца. Тут яны вельмі блізка блёкуюцца з вялікадзяржаўнымі расійскімі шавіністамі. Розьніца паміж першымі і другімі застаецца толькі фармальная. Адны шыпяць—ня трэба ніякай беларусізацыі, другія-ж пішчаць: ня трэба такой беларусізацыі. Розьніца, паўтараю, толькі фармальная і тая нават зводзіцца да аднаго слова. Па сутнасьці-ж і расійскія шавіністы і беларускія нацыянал-дэмакраты вядуць барацьбу супроць палітыкі партыі па нацыянальнаму пытаньню, супроць аднэй з яе галін—беларусізацыі, якая праводзіцца пралетарыятам. Як першыя, так і другія зьяўляюцца цкавальнікамі ўсяго нашага культурна-нацыянальнага будаўніцтва. Першыя з іх (шавіністы) падобны да таго доктарскага сабакі, які брэша на ўсё беларускае, а другія (нацыянал-дэмакраты) падобны да тых панскіх сабак, якія напалі на беларускага бедняка ў лапцёх і гатовы лізаць рукі ўсякаму пану ў лякіраваных ботах, абы толькі ён загаварыў па-беларуску.

Партыя вяла, вядзе і будзе весьці барацьбу на гэтыя два фронты як супроць расійскіх шавіністаў, так вяла, вядзе і будзе весьці барацьбу і з тымі, хто не даацэньвае справы беларусізацыі, хто супрацівіцца яўна ці скрыта правядзеньню аднэй з галін нашае нацыянальнае палітыкі.

А трэба адкрыта сказаць, што, апроч яўных выступленьняў як з боку шавіністаў, так і з боку нацыянал-дэмакратаў у нас ёсьць яшчэ цілае маўклівае „увільваньне" ад правядзеньня дырэктыў, якія дадзены партыяй і ўрадам у галіне правядзеньня беларусізацыі; як і ў іншых, так і ў гэтай галіне мы часта наглядаем яўна бюракратычныя адносіны да справы. Так, урад загадаў работу ўсіх нашых устаноў перавесьці на беларускую мову. І разам з поўным выкананьнем гэтае пастановы мы ў некаторых установах і асабліва трэстах маем толькі беларускі шыльд, толькі беларускія штампы і беларусізаваных больш-менш толькі машыністак.

МАЛЕНЕЧКАЯ ЭКСКУРСІЯ Ў НЕКАТОРЫЯ ЎСТАНОВЫ.

Зробім маленечкую экскурсію па некаторых трэстах і іншых установах і мы ўбачым, наколькі яшчэ фармальна, бяздушна падыходзяць да беларусізацыі. У гэтай экскурсіі нам дапамогуць і матар'ялы цэнтральнай нацкамісіі пры ЦВК, якая нядаўна зрабіла праверку выкананьня дырэктыў аб правядзеньні беларусізацыі. Характэрным у справе бюракратычнага правядзеньня беларусізацыі зьяўляецца Лесбел.

Справаводзтва на 80 процантаў пераведзена на беларускую мову. Шыльд і штампы—в беларускімі надпісамі, але прыгледзьцеся да ўсяе работы ўсяго калектыву працаўнікоў. Аб'явы, лёзунгі, календары, намэнклятура спраў і г. д.—усё на расійскай мове. Насьценная газэта, гутарка між супрацоўнікамі, гутарка з наведвальнікамі—яшчэ не закранулі беларускае мовы. І гэта ня гледзячы на тое, што роўна год таму назад Бюро ЦК КП(б)Б спэцыяльна застанаўлялася на беларусізацыі ў Лесбеле, ня гледзячы на тое, што былі дадзены катэгарычныя прапановы. Як відаць, за беларускімі шыльдамі таварышы з Лесбелу не пачулі нічога аб беларусізацыі і гэта ў такой установе, якая мае шмат наведвальнікаў-сялян і беларусізаваных рабочых.

У апаратах Дзяржгандлю Бел., Папертрэсту, ВСНГБ, Белкаапсаюзу справа з беларусізацыяй таксама пастаўлена яшчэ нездавальняюча. Шыльды, беларускія паперкі пішуцца па-беларуску, але жывой гутаркі, жывой, апроч канцылярскай работы, на беларускай мове няма. У пасьцепгазэтах, на пасяджэньнях, у гутарцы з наведвальнікамі беларуская мова распаўсюджваецца слаба.

Зусім дрэнна з беларусізацыяй абстаіць справа ў „Саюзхлебе" і Вайсковым Камісарыяце Менскай акругі. Гэтыя дзьве ўстановы, якія, дарэчы, цесна зьвязаны з тымі масамі, што гавораць па-беларуску, ня толькі няма пералому ў справе разгортваньня беларусізацыі, але нават наглядаецца некаторы адыход ад гэтае важнае і патрэбнае справы. Не гаворачы ўжо аб тым, што з супрацоўнікаў ніхто беларускай мовай не карыстаецца, што ў насьценнай газэце ня знойдзеш заметачкі на беларускай мове („Саюзхлеб"), што ў гэтых установах ня знойдзеш ніякіх адзнак, апроч шыльду аб тым, што яны знаходзяцца ў БССР, не гаворачы ўжо пра гэта, заўважваецца, што нават перапіска супроць мінулага году на беларускай мове зьменшылася. У Менакрваенкамаце нават перапіску з Райвыканкомамі пачалі весьці па расейскай мове.

Калі прадстаўнік нацкамісіі зацікавіўся такім становішчам і запытаў начальніка мабілізацыйнай часткі т. Цімафеева, праз рукі якога праходзіць большасьць перапіскі, чым ён тлумачыць такое зьявішча, дык апошні адказаў, што «паслабленьне ўвагі да беларусізацыі зьяўляецца нібыта вынікам таго, што іх у гэтай галіне ніхто не падштурхваў». Так-жа, прыблізна, адказаў і адказны сэкратар „Саюзхлеба" т. Шпакоўскі. Такое тлумачэньне зьяўляецца ўжо ня больш, ня менш як паклёпам на партыю, бо апошняя ўвесь час не спыняла сваёй увагі да справы беларусізацыі і давала належныя «штуршкі» усім тым, хто зарваўся, хто не прызнае патрэбным выконваць дырэктывы. І калі раней т. Цімафееву ці т. Шпакоўскаму не давалася „штуршкоў", дык яны будуць дадзены, але дадзены будуць так, што ад іх не паздаровіцца ім. Партыя і ўрад не паслаблялі ўвагі да гэтага пытаньня, а таварышы з Менакрваенкамату і „Саюзхлеба" лічылі, што патрэбны штодня спэцыяльныя дырэктывы, абежнікі, цыркуляры. Не, гэта ўжо занадта. Немагчыма-ж штодня даваць такія папяровыя „штуршкі". Ёсьць цэлы шэраг пастаноў, дырэктыў, паказаньняў, якія трэба выконваць, а не чакаць штодня новых паперак. Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, што таварышы з «Саюзхлеба» і Менакрваенкамату не зразумелі сутнасьці беларусізацыі, яны не зразумелі таго, што беларусізацыя—гэта ўсур'ёз і надоўга. Яны альбо ня ўцямілі важнасьці гэтага пытаньня, альбо не жадалі па іншых прычынах выконваць палітыкі партыі і ўраду аб правядзеньні беларусізацыі. Так ці інакш, але тое, што ў памянёных установах беларусізацыя затрымлівалася, гэта факт. І гэтым фактам былі, з аднаго боку, задаволены ўсе тыя, хто не задаволен усёю нашаю палітыкаю, гэта зьявішча іграла на руку расійскім шавіністам, з аднаго боку, і беларускім нацыянал-дэмакратам—з другога. Таварышы з „Саюзхлеба" і з Менакрваенкамату апынуліся ў ролі дапаможнікаў як мазырскаму доктару, так і панскім паслугачом.

Гэтыя дзьве апошнія праявы адыходу ад беларусізацыі трэба дасканала вывучыць; трэба выявіць, калі будзе шэраг другіх падобных фактаў, і трэба як належыць ударыць па іх.

ТРЭБА ЗАГЛЯНУЦЬ ЗА ШЫЛЬДЫ.

Мы ў справе беларусізацыі дабіліся значных вынікаў, але прыведзеныя факты кажуць аб тым, што дзені-дзе яшчэ ня ўсё добра, і таму ў бліжэйшы час трэба заглянуць за шыльды і паглядзець, як праводзіцца беларусізацыя ва ўсім нашым апараце, ва ўсіх нашых установах. Нельга ні ў якім выпадку застанаўляцца на тых дасягненьнях, якія мы маем у гэтай галіне, а трэба прасачыць за тым, каб усе дырэктывы партыі і ўраду былі выкананы. На сучасным этапе нашага будаўніцтва нельга-ж застанаўляцца на тым, што ў той ці іншай установе перапіска вядзецца на беларускай мове. Трэба беларускую мову прасунуць у быт, ва ўсе галіны нашага культурнага жыцьця. Нельга таксама зводзіць усю беларусізацыю да справы аўладаньня беларускай мовай. Трэба пашыраць у масах і ўсё адзнакі беларускай пралетарскай культуры. Праўда, апошняя дойдзе да мас на беларускай мове ў першую чаргу і для гэтага трэба, каб нашы клюбы, бібліятэкі, чырвоныя куткі, хаты-чытальні, розныя гурткі павялічылі ўвагу да беларусізацыі, да беларускае пралетарскае кнігі, да беларускай савецкай і партыйнай газэты, да беларускіх сьпеваў, пастановак і г. д.

* * *

Вядучы барацьбу з расейскім вялікадзяржаўным шавінізмам і, у першую чаргу, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, які асабліва небясьпечны на даным этапе, мы павінны ўзмацніць увагу ўсяе рабочае клясы, усяе савецкае грамадзкасьці да справы беларусізацыі. Правядзеньню апошняй трэба надаць баявы характар. Трэба правесьці праверку выкананьня ўсімі арганізацыямі і ўстановамі дырэктыў партыі і ўраду ў галіне беларусізацыі. Трэба заглянуць за шыльды.

ЯН. ПАЎЛОЎСКІ.

ПАХОДЗІМ ПА РАБОЧЫХ КЛЮБАХ.

Клюбы—цэнтр культасьветнай працы і папулярызацыі нацыянальнай палітыкі Тым больш у рабочых клюбах павінна было праводзіцца вывучэньне беларускай мовы, папулярызацыя і ўнядрэньне беларускай літаратуры.

Гэтага яшчэ няма. Рабочыя клюбы пакуль што толькі складаюць пляны і прыгожыя рэзалюцыі аб беларусізацыі...

Павольна—праз пень-калоду праводзіцца беларусізацыя сярод рабочых.

Паходзім па рабочых клюбах!..

„Аб'ектыўныя" ўмовы.

Адносна беларусізацыі пытаеце?

Заг. клюбам нархач сьціскае плячыма:

— Не, яшчэ пакуль што не пачыналі, але вось рыхтуем пляны. Мы нават мяркуем арганізаваць гурток па вывучэньні беларускае мовы.

Папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры клюбам не праводзіцца ня гледзячы на тое, што клюб абсчытоўвае звыш 2000 хатніх работніц, пераважна з вёсак.

У калідоры клюбу шумна ад вялікага натоўпу людзей. На сьцяне вісіць насьценгазэта, але яна выключна, акрамя назвы і лёзунгаў, выдана на расійскай мове.

Заг. клюбам тлумачыць усё гэта „аб'ектыўнымі ўмовамі", бо сябры праўленьня не працуюць, а ён яшчэ не знаёмы з працаю, як новы (!) чалавек...

„На пляну прадугледжана".

Клюб будаўнікоў.

— Загадчыка клюбам шукаеце?

— Яго зараз няма! Невядома калі будзе...

Тлумачэньні адносна тэмпу беларусізацыі дае нам клюбны актывіст—член праўленьня.

— Бясспрэчна,—кажа ён,—яшчэ да гэтуль няма пералому ў сэнсе выкананьня дырэктыў аб папулярызацыі і ўнядрэньні беларускай мовы.

У нас у летні час быў супольны гурток прафэсыйнай граматы і беларускай мовы (!). Часам практыкавалі масавыя вечары на беларускай мове.

— А зараз што робіцца?

— Яшчэ нічога, але вось па пляну прадугледжана арганізацыя гурткоў і г. д.

— Як у вас рабочыя сходы праводзяцца—на беларускай мове?—пытаю ў дарослага рабочага-будаўніка.

— Не,—адказвае ён,—за рэдкім выключэньнем праводзяцца; даклады, гутаркі, выступленьні артыстаў—усё парасейску.

Праўленьне беларусізавана

Заг. клюбам харчавікоў стараецца ўсё прадставіць у ружовых фарбах.

— Нацыянальная палітыка партыі знаходзіць поўны адбітак ва ўсёй сыстэме нашае працы. У нас пасяджэньні праўленьняў праводзяцца на беларускай мове, бібліятэка мае шмат беларускіх кніг, у летні час працаваў гурток па вывучэньні беларускай мовы...

А зараз?

— Зараз,—згаджаецца заг. клюбам,—праца праводзіцца слаба. У арганізаваны беларускі гурток запісалася толькі 14 чалавек—большасьць служачыя, масавых вечароў беларускай літаратуры не практыкуем, хоць—дадае ён—па пляну прадугледжана правядзеньне ў сьнежні вечара сустрэчы з беларускімі пісьменьнікамі і паэтамі...

Усё будзе, а пакуль...

Заг. клюбам друнароў на пытаньне—як праводзіцца беларусізацыя—адказвае:

— У нас нават правілы ўнутранага распарадку напісаны на беларускай мове...

— А канкрэтна што зроблена клюбам у сэнсе папулярызацыі нацыянальнай палітыкі?

Заг. клюбам суха адказвае:

— Усё будзе. Мы адчыняем гурток па вывучэньні беларускай мовы, а таксама гісторыі беларускай літаратуры. Вядзецца падрыхтоўчая праца да стварэньня беларускага драматычнага гуртка.

А пакуль праца яшчэ не разгорнута.

У гурткі па беларусізацыі ніхто не запісваецца.

— У нас ужо ёсьць пэўны пералом у галіне беларусізацыі,—кажа таварыш з праўленьня клюбу чыгуначнікаў,—сходы праводзяцца на беларускай мове, па гэтай жа мове працуе драмгурток, антырэлігійнікі...

Мы лічым, што гэтыя „дасягненьні" ў галіне правядзеньня нацпалітыкі нельга лічыць здавальняючымі. Ні для каго не сакрэт, што ёсьць выпадкі, калі дакладчык гаворыць пабеларуску, а як скончыцца сход, зноў узвяецца беларуская мова, пакуль ня трэба будзе выступіць дзе.

Пара ўжо адказацца ад гэтай руціны, ад казёншчыны пры правядзеньні беларусізацыі. Трэба пашыраць сярод рабочых мас беларускую мову.

І. М.

ПАТРАБУЕМ ПАВЫШЭНЬНЯ ЯКАСЬЦІ

Мы ўжо вышлі з тэй стадыі, калі досыць было ведаць некалькі беларускіх слоў, каб гэтым адмежавацца вывучэньнем беларускай мовы і літаратуры. Беларуская культура, літаратура за апошнія часы зрабілі вялікія дасягненьні.

Але тэорыя—гэта адно, а практыка—другое. Здавалася-б, наш Гарсавет павінен быў паклапаціцца аб тым, каб надпісы ў вагонах трамваю былі зроблены на граматнай беларускай мове. Ня гледзячы на тое, што трамвай зьяўляецца ў нас імяньнінікам, што мы вельмі рады яму, аднак мусім заўважыць, што гэтыя надпісы нікуды ня варты з пункту погляду пісьменнасьці іх.

Вось вам сказ: «Бярыце білеты, ня чакаючы патрабаваньня кандуктара». Гэта літаральны пераклад з расейскага. Як гэта можна чакаць „патрабаваньня кандуктара"? Ці ня лепш было напісаць: «Бярэце білеты, не чакаючы пакуль кандуктар ня скажа".

Тут жа пэбач можаце ўбачыць: „Не перашкаджайце разьменам буйных грошай", „32 месца".

Няўжо Гарсавет ня мог зьвярнуцца да каго-небудзь, каб даць граматны тэкст надпісаў, якія зараз мазоляць вочы сваёй бязглуздасьцю.

Белдзяржкіно нейкі час імкнулася больш-менш наладзіць надпісы на фільмах на правільнай беларускай мове. Але зараз можна зноў спаткаць такія слоўцы, якія цяжка бывае нават зразумець.

Што, напрыклад, азначае «Кемлівае вока" ў карціне „Нанук"? Чаму Белдзяржкіно ў гатай жа карціне шырока распаўсюджанае ўсім вядомае беларускае слова „рыцына" вамяняе расейскай назвай—„касторовое масло"? Можна было-б прывесьці яшчэ шмат ляпсусаў у надпісах, але шкода месца.

Надобныя „пэрлы" беларусізацыі можна таксама знайсьці ў рэцэптах Менскага „здраўаддзелу" (так і напісана). Вось што мы там знаходзім: „Падмятайце падлогу мокрай трапкай (а не анучай, «Мойце рукі перад ядой». Па-беларуску кажуць ня **мойце, а мыйце**; не **здраўаддзел, а аддзел аховы здароўя**.

Гэта «дробязі», але гэткія дробязі сьведчаць аб якасьці беларускай мовы, аб тым, што да справы беларусізацыі адносяцца нядбайна, няўважліва!

Беларусізацыя, як яе разумеюць у Наркамгандлі.

Аб беларусізацыі пішуць і гавораць многа, але яшчэ да апошняга часу, трэба прызнацца, гэтыя гутаркі і друк не даюць станоўчых вынікаў, і да гэтага часу ў шмат якіх наркаматах справу беларусізацыі праводзяць толькі... машыністкі.

Я хачу паведаць адзін вельмі кур'ёзны факт, які яскрава характарызуе, як у нас машыністкі зьяўляюцца заўсёды вінаватымі за ўсе грахі ў гэтай справе.

Справа адбываецца ў адным з нашых буйных наркаматаў—Наркамгандлі. Адзін з тэхнічных, але адказных працаўнікоў прыносіць машыністцы перапісаць вялікі плян—апошні напісан на беларускай мове. Машыністка ў працягу некалькіх гадзін друкуе гэту працу, а праца марудная, мае шмат рэзалюцый і значны тэкст. Нарэшце, праца скончана, машыністка пасьля цяжкай працы зьбіраецца некалькі хвілін адпачыць, але не пасьпела яна пасядзець і 2 хвілін, як гэты самы супрацоўнік сьпешна ўбягае ў пакой і гістэрычным тонам залуляе:

— Ня добра, трэба пасадкладна перапісаць.

— У чым справа?—пытаюцца пера палоханыя на сьмерць машыністкі.

— А вельмі проста, гэты плян трэба на друкаваць на... расейскай мове, бо прыдзецца паслаць экзэмпляр у Маскву...

— Ну, што-ж рабіць, дайце расійскі тэкст,—згаджаецца машыністка,—і мы зноў перапішам.

— **Будзьце ласкавы неадкладна перакладаць самі!**—закрычаў ва ўсё горла чыноўнік Наркамгандлю.

— Дазвольце,—пачала бараніцца ахвяра чыноўніка,—я ня ў сілах перакласьці, і нарэшце, не павінна...

— Добра, вельмі добра,—пацешыўся чыноўнік,—я аб гэтым паведамлю, куды трэба.

— Рабіце, што хочаце, але я ня ў сілах перакладаць, я магу зрабіць шмат памылак, дайце расійскі тэкст, і мы вам перапішам...

Чыноўнік бразнуў дзьвярыма і вышаў, а праз два дні быў вывешан на сьцяне наступны выгавар машыністцы: «За адмову перакласьці беларускі тэкст на расійскі—машыністцы такой-та абвяшчаецца суровы выгавар".

Рэкорд пабіты! Проста дзіва, да чаго даходзяць адказныя працаўнікі ў Наркамгандлі. Няўжо яны ня ведаюць, што беларускую мову ў першую чаргу павінны ведаць адказныя кіраўнікі, няўжо яны ня ведаюць, што машыністка не абавязана ў Наркамгандлі быць абавязкова перакладчыцай.

Як відаць, яны гэтага ня ведаюць, і неабходна, каб хто-небудзь ім гэта давёў і растлумачыў.

Выгаварам, зразумела, трэба іншы раз карыстацца, і калі-б у мяне запыталіся каму зрабіць выгавар, дык я зрабіў бы яго той асобе, якая зрабіла выгавар машыністцы, гэта было-б больш карысна і рацыянальна.

Л. Арскі.

Двухмоўныя.

У КАНЦЭЛЯРЫІ.

— Вам справку? Пожалуйста.

Даведка.

Выдадзеная гэтая т. Міхалкевіч у тым, што яна...

— Вы у нас с ноября работаете?

— Не, раней.

— Сейчас проверим. Михалкевич... Михалкевич... **з 15-га кастрычніка...**

— С октября месяца.

... з 15-га кастрычніка па 20 студзеня працавала...

— Садитесь!

... У якасьці канторшчыка...

— Много конторщиков на бирже?

— Не, чалавек дзесяць.

... і атрымлівала 50 (пяцьдзесят) рублёў у месяц. Звольнена па скарачэньню штата.

— т. Лисицын, подпишите.

— Аванс высчитали?

— Да.

— Куда думаеце двигать, товарищ Михалкевич? На бирже конторщиков много?

— Вам что?

— З нацкаімсіі. Вы атрымалі паперку аб абсьледваньні?

— А, калі ласка, сядайце.

— Адну хвіліну, таварышы. От паперы падпішу.

Сябра камісіі і загадчык пайшлі ў габінэт.

— Таварыш, а дзе бухгальтэрыя?

— По коридору первая комната направо.

... У зьвязку з рэарганізацыяй фінансавага аддзелу, прапануецца Вам...

— Григорий Алексеевич, дать им неделю срока?

— Да.

... У працягу тыдня даць зьвесткі па наступнай форме...

— Нина Сергеевна, формы напечатали?

— Сию минуту. Кончаю.

Машыністка друкавала:

У графе 3 даюцца...

— Григорий Алексеевич, сведения о финансовом состоянии учреждения даются на 1 января?

— Да, да.

... зьвесткі аб фінансавым становішчы ўстановы на 1 студзеня.

НА ЗАНЯТКАХ ХАРАВОГА ГУРТКА.

— Аааа... ааа...

— Внимание.

— До-ми-соль-до! Давайте!

Ад ве-е-ку мы спа-а-а-лі, но нас разбудзілі.

— Усиливайте! Усиливайте!

Ска-а-залі, што трэ-э-ба рабіць,

Што трэ-э-ба свабо-о-ды...

— Остановить! Вы Платонов режете, режете определенно. Слушайте:

Ска-а-залі, што трэ-э-ба рабіць...

— Нужно рот больше открывать, а вы хрипите! Прослушайте, я на скрипке еще сыграю:

Та-ти-ра-ра-ра-ра. **Ска-а-залі, што трэ-э-ба рабіць.**

— Мало товарищи иметь голос, надо уметь им владеть.

Ад ве-еку мы спа-а-лі, но нас разбудзілі...

— Пойте! Пойте! Что вы думаете?! Та-ти-ра-ра-ра-ра.

Што трэ-э-ба сва-а-боды зямлі чалавеку...

— Басы, не напирай! Свабодней.

Што трэ-э-ба сва-а-боды зямлі чалаве-е-ку.

НА РЭПЭТЫЦЫЯХ ДРАМАТЫЧНАГА ГУРТКА.

— **Янка, слухай! Я пайду з табою! Я ведаю, там пабудуем мы новае, лепшае жыцьцё. Я, маладая! Янка, я люблю цябе.**

— Нет! Нет! Слушайте!—**Янка, слухай! Я пайду з табою. Я ведаю, там пабудуем мы новае, лепшае жыцьцё".**

У Савеце Народных Камісараў.

На апошнім чарговым пасяджэньні Савету Народных Камісараў пад старшынствам тав. М. М. Галадзеда былі разгледжаны разам з іншымі наступныя пытаньні:

ПРА ПЕРАВОД НЕКАТОРЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НА СЯМІГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

СНК згадзіўся з прапановамі НК Працы аб пераводзе ў бягучым 1929-30 гаспадарчым годзе на сямігадзінны рабочы дзень наступных прадпрыемстваў прамысловасьці БССР: фанэрнага заводу «Чырвоны Кастрычнік», заводу „Дрэвапрацоўшчык", макароннай фабрыкі ў Барысаве, гуты „Домбаль" і хэміка-фармацэўтычнага заводу ў Менску. Гэтая прапанова ўносіцца на зацьверджаньне Урадавай Камісіі СССР па пераводу прадпрыемстваў прамысловасьці на сямігадзінны рабочы дзень. Урадавай камісіі БССР даручана пры далейшай распрацоўцы пытаньня аб пераводзе прадпрыемстваў прамысловасьці БССР на сямігадзінны рабочы дзень зьвярнуць увагу на перавод тых прадпрыемстваў, дзе рабочыя працуюць у больш цяжкіх умовах.

ПРА БУДАЎНІЦТВА ФАБРЫКІ ШТУЧНАГА ВАЛАКНА Ў МАГІЛЕВЕ.

СНК заслухаў даклад аб ходзе будаўніцтва ў г. Магілеве фабрыкі штучнага валакна. Пабудова гэтай фабрыкі мае вялікае значэньне для ўздыму індустрыялізацыі БССР. Гэта адна з першых фабрык у Саюзе ССР новай галіны прамысловасьці.

СНК адзначыў некаторыя недахопы і перашкоды ў правядзеньні будаўніцтва гэтай фабрыкі. Так, позна зацьверджан эскізны праэкт будынкаў фабрыкі, несвоячасова паданы канчатковы праэкт, а таксама не загатоўлен поўны асартымэнт патрэбных будаўнічых матар'ялаў. Усё гэта затрымала пачатак будаўніцтва да 25-VII г. г.

Для зьнішчэньня гэтых недахопаў і для забясьпечаньня сканчэньня будаўніцтва і пуску фабрыкі ў тэрмін, СНК запрапанаваў Кіраўніцтву будаўніцтва фабрыкі і Дзяржбуду ўжыць усе патрэбныя захады да таго, каб плян будаўніцтва чатырох карпусоў фабрыкі быў выкананы не пазьней 1-XII—1929 г. Адначасна з паскораньнем тэмпу работ Белдзяржбуд павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу на дастатковае забясьпечаньне будаўніцтва патрэбнай колькасьцю інжынэрна-тэхнічных сіл адпаведнай кваліфікацыі.

Для таго, каб было магчыма пусьціць фабрыку ў кастрычніку 1930 г., СНК запрапанаваў Асінбуду ўжыць належныя захады да таго, каб у вызначаны тэрмін была дадзена фабрыцы электрычная энэргія Асінаўскай электрастанцыі, а таксама ўжыць належныя захады, каб хутчэй далучыць апошнюю да Магілева. Пры фабрыцы мяркуецца пабудаваць спэцыяльную цёплаэлектрацэнтраль для забясьпечаньня бесперабойнай працы фабрыкі.

Для забясьпечаньня вытворчасьці фабрыкі серавугляродам, СНК прызнаў неабходным пабудаваць у г. Магілеве серавугляродны завод, магутнасьцю ў тысячу тон у год.

ВСНГ і Кіраўніцтву будаўніцтва фабрыкі штучнага валакна даручана ўключыць у плян будаўніцтва фабрыкі пабудову спэцыяльных будынкаў для абслугоўваньня культурна-бытавых умоў работы (клюб, амбуляторыя і інш.), а таксама прадугледзець патрэбныя сродкі на будаўніцтва кватэр для рабочых з тым, каб гэтае будаўніцтва ішло разам з будаўніцтвам самой фабрыкі. ВСНГ даручана тэрмінова зрабіць досьледы адносна запасаў торфу вакол г. Магілева і своечасова ўжыць усе належныя захады да падрыхтоўкі забясьпечаньня фабрыкі штучнага валакна кваліфікаванаю рабочаю сілаю.

ПРА СТЫПЭНДЫІ ВУЧНЯМ НАВУЧАЛЬНА-ПРАКТЫЧНЫХ МАЙСТЭРНЯЎ.

СНК абавязаў акруговыя выканаўчыя камітэты забясьпечыць з 1-X—29 г. стыпэндыямі на менш 25 проц. вучняў усіх навучальна-практычных майстэрняў.

ЧАЦЬВЁРТЫ ТЫРАЖ РОЗЫГРЫШАЎ ПАЗЫКІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ—У М. ВЕТРЫНЕ, ПОЛАЦКАЙ АКРУГІ

13-га кастрычніка г. г. у м. Ветрыне, Полацкай акругі, пачаўся 4-ы тыраж выйгрышаў пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі (48 і 11 сэрыі). Да тыражу была праведзена належная праца. Амаль па ўсіх сельсаветах акругі адбыліся спэцыяльныя сходы з дакладамі пра тыраж у Ветрыне і аб карысьці дзяржаўных пазык наогул. На гэтых-жа сходах распаўсюджвалася III пазыка індустрыялізацыі. Папярэднія вынікі надзвычайна добрыя.

Перад тыражом акруговы камітэт КП(б)Б разам з акруговым выканаўчым камітэтам зьвярнуліся са спэцыяльнай адозвай да ўсіх працоўных Полаччыны, у якой заклікаюць да яшчэ хутчэйшага выкананьня плянаў сацыялістычнай індустрыялізацыі, да больш шырокага прасоўваньня дзяржаўных пазык у працоўныя гушчы.

Раніцой у дзень тыражу члены тыражнай камісіі, якіх налічваецца 50 асоб, выехалі у м. Ветрына. У Ветрыне камісія была ўрачыста спаткана працоўнымі.

Сяляне Ветрынскага сельсавету, каб адзначыць тыраж, які здбываецца ў іх мястэчку, арганізавалі чырвоныя абозы з хлебам, якія складаліся з 500 падвод. На мітынгу выступалі прадстаўнікі раённых і іншых арганізацый, а таксама сяляне ваколічных вёсак.

З далёкіх глухіх куткоў Ветрынщчыны на тыраж прышлі і прыехалі сяляне.

Адчыняецца ўрачыстае пасяджэньне. Народны дом перапоўнен. На вуліцах тысячы сялян, сялянак і моладзі. Заля ня можа ўмясьціць усіх жадаючых прысутнічаць. Урачыстае пасяджэньне адчыняе старшыня тыражнай камісіі тав. Ступакоў, які ніяк іншым, адзначыў наступнае:

— Калі там,—кажа тав. Ступакоў,—за мяжой, сусьветная буржуазея набівае за кошт працоўных свае кішэні, у нас адбываецца сацыялістычнае будаўніцтва. Калі там, у панскай Польшчы, рабочыя і сяляне знаходзяцца пад уціскам, у нас, у СССР—воля. Дзяржаўныя пазыкі заўсёды падтрымоўвалі працоўныя масы СССР, якія пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будуюць сьветлае, новае жыцьцё.

— Дазвольце ад імя Полацкага АК КП(б)Б,—кажа тав. Скараход,—вітаць вас з правядзеньнем тыражу. Камуністычная партыя і савецкая ўлада разгортваюць вялікае сацыялістычнае будаўніцтва. Для гэтага патрабуюцца вялізныя сродкі. Дзяржаўныя пазыкі зьяўляюцца самай лепшай формай сьвядомай дапамогі гэтаму будаўніцтву. Пад чырвонымі сьцягамі пойдзем да новых заваёў.

— Сяляне Валынскай акругі,—выступае тав. Ужэнюк (Украіна),—даручылі перадаць праз мяне шчырае прывітаньне працоўным Савецкай Беларусі, якія разам з іншымі вольнымі народамі на справе ажыцьцяўляюць задачы партыі і ўлады.

Далей выступалі з прывітаньнямі,—сэкратар Ветрынскага РК КП(б)Б, селянін Мазырскай акругі, старшыня Ветрынскага РВК, калгасьнік Дрысенскага раёну, ад райграфбюро, ад Наркамфіну СССР, ад калгасьнікаў Пухавіцкага раёну (Меншчына), ад дзіцячага гарадка імя Леніна, адказны сэкратар тыражнай камісіі (прадказны стаўнік НКФ СССР т. Ульянаў), якія ў сваіх прамовах зазначылі, што толькі Савецкі Саюз зьяўляецца бацькаўшчынай працоўных усяго сьвету.

На тыражу адчынены сталы даведак, касы ашчаднасьці, даюцца розныя даведкі. Тыражная камісія складаецца з прадстаўнікоў устаноў акругі, з дэлегатаў ад сялян усіх акруг Беларусі і ад усіх раёнаў Полацкай акругі. У якасьці сяброў тыражнай камісіі запрошаны прадстаўнікі ад Каросьценскай і Жытомірскай округ УССР і прадстаўнік Узьбекскай ССР. Прыехалі прадстаўнікі Роменскай, Кіеўскай, Чарнігаўскай, Нежынскай, Кантонскай, Цьвярской і інш. округ.

У часе перапынку грае духавы аркестр. Наладжваюцца дэлегацыі сялян ад кожнага сельсавету Ветрынскага р., прыяжджаюць рабочыя і служачыя, а таксама чырвонаармейцы.

Будзе разыграна для кожнай—48 і 11 сэрый—па 1386 выйгрышаў, на агульную суму 175.000 руб. Тыраж працягнецца 4-5 дзён.

С—н Міх.

ХРОНІКА.

Ненармальнасьці ў Цэнтр. Доме Селяніна

П'янства, распуста, зажым самакрытыкі.

Камісія НК РСІ праверыла стан працы ў Менскім Цэнтральным Доме Селяніна.

З матар'ялаў відаць, што праца ў Доме ў заняпадзе. Абслугоўваючы пэрсанал груба адносіцца да наведвальнікаў-сялян, асабліва работнікі Дому Філановіч і Голасаў. Апошнія п'янствавалі, наладжвалі папойкі разам з прастытуткамі...

Мясцком ніякай культвыхаваўчай працы не праводзіў і некаторыя члены мясцкому прымалі ўдзел у „вясёлай" кампаніі Голасава.

Сярод абслугоўваючага пэрсаналу наглядаўся поўны заняпад працоўнай дысцыпліны, сацыялістычнае спаборніцтва не адчувалася.

Ня гледячы на тое, што мясцком ведаў аб усіх гэтых ненармальнасьцях і саюзу аб гэтых момантах не інфарміраваў.

З боку адміністрацыі таксама ня было ініцыятывы да палепшаньня працы. Адміністрацыя і мясцком ня прымалі захадаў да зьнішчэньня нетэхопаў. Прэзыдыум праўленьня [illegible] Пар. Харчаваньня, па абгаварэньні матар'ялаў абсьледваньня, вызначыў шэраг мерапрыёмстваў да палепшаньня працы ў Доме Селяніна, а таксама працы мясцкому.

Саюз рашуча пратэстуе супроць аднаўленьня НК Працы на ранейшай пасадзе гр. Коласава і патрабуе зьняць яго.

Усебеларускі зьезд рабочых ударных груп.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці ў другой палове лістапада Усебеларускі Зьезд рабочых ударных брыгад.

Падрыхтоўчая праца да зьезду будзе разгорнута з другой паловы кастрычніка. На ўсіх прадпрыёмствах будуць праведзены фабрычна-завадзкія канфэрэнцыі па сацыялістычнаму спаборніцтву. Канфэрэнцыі абгавораць вынікі праверкі дагавораў на сацыялістычнаму спаборніцтву і задачы зьезду ўдарных брыгад.

У першай палове лістапада па ўсіх округах адбудуцца акруговыя канфэрэнцыі па сацыялістычнаму спаборніцтву. Да дню акруговых канфэрэнцый будуць наладжаны выстаўкі-агляды ходу сацыялістычнага спаборніцтва.

Уся падрыхтоўчая праца да Ўсебеларускага Зьезду ўдарных рабочых брыгад будзе праводзіцца ўзмоцненым тэмпам; паміж округамі будзе праводзіцца спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да зьезду.

Падрыхтоўка новых кадраў брыгадзіраў.

ЦП саюзу мэталістаў запрапанавала Белмэталётрэсту пры кожным буйным прадпрыёмстве арганізаваць курсы для падрыхтоўкі новых кадраў майстроў і брыгадзіраў. Курсы павінны быць адчынены з 1 лістапада.

* * *

Прымаючы пад увагу, што ў БССР ёсьць недахоп рабочых-будаўнікоў, прэзыдыум Дзяржпляну ўхваліў падрыхтаваць новыя кадры кваліфікаваных будаўнікоў.

Усяго будзе падрыхтавана 5160 чалавек рабочых, з іх у будаўнічым сэзоне павінна будзе працаваць 4000 чалавек.

На падрыхтоўку кадраў вызначана 1640050 рублёў.

Рэарганізацыя дадатку „Саветы Беларусі" ў штомесячную часопісь.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў у мэтах палепшаньня выданьня дадатку да газэты «Савецкая Беларусь»—„Саветы Беларусі", а таксама ў мэтах эканоміі паперы лічыць неабходным рэарганізаваць дадатак у самастойную штомесячную часопісь пад тэй-жа назвай.

Рэдакцыйнай камісіі часопісі «Саветы Беларусі» даручана распрацаваць парадак і характар выданьня, а таксама ўмовы падпіскі.

Падрыхтоўка да кастрычніцкаўскіх урачыстасьцяў.

ЦП саюзу хэмікаў запрапанаваў усім фабзавкомам заняцца на мясцох падрыхтоўкай да сьвяткаваньня 12-й гадавіны Кастрычніка. Сьвята павінна прайсьці пад лёзунгам палітычных задач, якія ў сучасны момант стаяць перад рабочай клясай.

* * *

Саюз Нархарч распрацаваў плян сьвяткаваньня кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў.

— Па клюбах, фабрыках і заводах будуць праведзены масавыя сямейныя вечары. Таксама наладжваюцца выезды рабочых у падшэфныя вёскі

Сьвята будзе праводзіцца пад лёзунгам выкананьня 5-ці гадовага плану сацыялістычнага будаўніцтва.

Пабудова заводу.

Дзяржплян згадзіўся з пастановай Наркамгандлю аб пабудове заводу для апрацоўкі бульбы.

Гэты завод мяркуецца пабудаваць на колфондзе Мар'іна, дзе шмат бульбы і яна добрай якасьці. Завод апрацуе 8200 тон бульбы.

Асьветнікі на трактарную калёну.

Менскія асьветнікі за некалькі дзён сабралі на арганізацыю беларускай трактарнай калёны 600 руб. Збор сродкаў на гэту мэту працягваецца і праходзіць з посьпехам. Асьветнікі практыкуюць выклікі праз насьценгазэты, збор па падпісных лістох.

Арганізацыя новага вандроўнага тэатру.

Культаддзел ЦСПСБ распрацаваў праэкт арганізацыі новага беларускага рабочага вадроўнага тэатру, які будзе абслугоўваць рабочыя клюбы і прадпрыёмствы, асабліва тыя з іх, што знаходзяцца ў глухіх куткох БССР. У аснову тэатру мяркуецца ўзяць калектыў, які абслугоўваў манэўры Чырвонай арміі.

Прэзыдыум ЦСПСБ прынцыпова згадзіўся з арганізацыяй такога тэатру і даручыў культаддзелу супольна з Наркамасьветы прапрацаваць пытаньне аб зьмесьце працы тэатру і аб сродках на яго ўтрыманьне. Тэатр мяркуецца арганізаваць яшчэ сёлета.

Антысэмітаў прэч з саюзаў!

Прэзыдыум саюзу мэталістаў выключыў з саюзу былога члена саюзу мэталістаў Ігнатковіча, які, будучы старшым рабочым, зьдзекваўся над рабочым-яўрэем т. Фундэлерам.

* * *

Супрацоўнікі РК № 3 МЦРК выключылі з саюзу работніка прылаўка Хадасэвіча за грубыя антысэміцкія адносіны з пайшчыкамі.

Прэзыдыум саюзу гэту пастанову зацьвердзіў.

Каапэруем поўнасьцю беднату і батраку.

Да 1 кастрычніка бягучага году ў спажывецкай каапэрацыі Меншчыны налічваецца 108.000 пайшчыкаў з 930.000 руб. пайвога капіталу.

Менскі АВК запрапанаваў аддзяленьню Белкаапсаюзу супольна з райвыканкомамі да 1 студзеня 1930 году каапэраваць 100 проц. бядняцкіх гаспадарак батраку.

Выплата заработку ўдзельнікам манэўраў.

Ёсьць шэраг выпадкаў, калі адміністрацыя прадпрыёмстваў і ўстаноў ня выплачвае ўдзельнікам манэўраў іх сярэдняга заработку.

Наркамправы БССР даў на месцы катагарычнае распараджэньне, каб удзельнікам манэўраў быў выплачан сярэдні заработак за час знаходжаньня на манэўрах.

У ТД Авіахіму.

Прэмія за лепшую рэалізацыю лётарэйных білетаў.

За рэалізацыю білетаў 3-й усесаюзнай лётарэі Асо-Авіахіму выладзена грашовая прэмія саветам Аршанскай, Гомельскай і Віцебскай округ.

4-я лётарэя Асо-Авіяхіму.

Цэнтральны Савет Асо-Авіахіму распачаў падрыхтоўчую працу да рэалізацыі білетаў 4-й усесаюзнай лётарэі Асо-Авіахіму. У БССР усяго намечана рэалізаваць 450 тысяч білетаў.

На беспераплынны рабочы тыдзень.

Цэнтральны Савет Асо-Авіахіму пераведзен на беспераплынны рабочы тыдзень.

ПРАФСАЮЗЫ І ГАСПАДАРНІКІ СЬПЯЦЬ

ПЕРАХОД НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ НЕ РАСТЛУМАЧВАЕЦЦА РАБОЧЫМ.—РАБОЧЫЯ МАСЫ НЯ ЎЦЯГНУТЫ Ў ПРАПРАЦОЎКУ ГЭТАГА ПЫТАНЬНЯ.

(З РАБОЧАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ФРУНЗАЎСКАГА РАЁНУ).

З вялікай увагай слухала канфэрэнцыя даклад нам. старшыні ЦСПСБ тав. Розіна аб пераводзе прамысловасьці на беспераплынны рабочы тыдзень.

Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла шырокія масы працоўных; дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву мы навіраем па асобных галінах прамысловасьці выкананьне і перавыкананьне плянаў. Сацыялістычнае спаборніцтва дапамагло выправіць недахопы, якія назіраліся ў першым паўгодзьдзі. Першы год нашай 5-цігодкі бліскуча адхіліў усе прароцтвы правых ухілістаў аб немагчымасьці выкананьня вызначанага пляну індустрыялізацыі.

Новыя дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва трэба заключыць у працягу кастрычніка; яны павінны заключацца на аснове прамфінпляваў прадпрыёмстваў; але па шмат якіх прадпрыёмствах гэтыя пляны адсутнічаюць, што, бязумоўна, не дае магчымасьці разгарнуць працу па заключэньню дагавораў.

Інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад нашай прамысловасьці максымальных тэмпаў. Для гэтага нам трэба загрузіць нашы фабрыкі і заводы так, каб машыны і варштаты не сталі бяз працы. Дагэтуль у нас у працягу году 77-78 дзён машыны і варштаты адпачываюць, што складае пятую частку году. Гэты час трэба таксама загрузіць працай. Зразумела, загрузка машын і варштатаў павінна ісьці не за рахунак адпачынку рабочых. Тут нам павінна дапамагчы ўвядзеньне ў прамысловасьці беспераплыннага рабочага тыдню, пераход на які яшчэ больш узмацніць нашу гаспадарку, скароціць тэрміны новага будаўніцтва, павялічыць выпуск прадукцыі і колькасьць рабочай сілы.

Па БССР ужо пераведзена на беспераплынны тыдзень 12 прадпрыёмстваў, на працягу году мяркуецца перавесьці яшчэ 40 прадпрыёмстваў, што дасьць магчымасьць павялічыць колькасьць рабочых на 2000 чалавек. Пытаньне пераводу прамысловасьці на беспераплынны рабочы тыдзень вельмі сур'ёзнае, а нашы прафсаюзы яшчэ вельмі мала зрабілі і робяць для таго, каб растлумачыць рабочым значэньне гэтай справы. Пытаньні пераходу на беспераплынны тыдзень дастаткова не прапрацаваны ні прафсаюзамі, ні гаспадарнікамі, а рабочыя масы амаль зусім ня ўцягнуты ў абгаварэньне гэтага пытаньня. Рабочая канфэрэнцыя павінна зрабіць пералом у гэтай справе.

У заключэньне т. Розін спыняецца на неабходнасьці ўзмацніць тэмп пераходу на беспераплынны тыдзень культурна-бытавых устаноў; павінна быць перабудавана і масавая праца, каб ёю былі ахоплены ўсе рабочыя.

Па дакладу т. Розіна выказалася 10 чалавек. Усе выступаўшыя таварышы прасілі дакладчыка растлумачыць тыя або іншыя пытаньні ў справе пераводу прадпрыёмстваў на беспераплынны тыдзень. Гэта яшчэ раз падкрэсьлівае, што на мясцох не праведзена навокал гэтага пытаньня растлумачальная праца. Нельга не адзначыць і таго факту, што ў спрэчках ня выступіў ні адзін гаспадарнік, ня было чуваць на канфэрэнцыі і голасу ВСНГБ, нібы іх гэта пытаньне не датычыцца.

Аб калегіі абаронцаў.

Ці патрэбна абарона ў савецкім судзе?

На чыстцы ячэйкі Народнага Камісарыяту Юстыцыі, якая зараз адбываецца, па дакладу тав. Сташэўскага некаторыя, крытыкуючы калегію абаронцаў, як адзін з органаў НКЮ, паставілі пытаньне аб неабходнасьці яе ліквідацыі. Гэтыя пытаньні ставяцца не ўпярыню. Ці патрэбна пры дыктатуры пралетарыяту, асабліва зараз, у момант абостранай клясавай барацьбы, такая арганізацыя, члены якой у сваёй практычнай дзейнасьці абараняюць перад савецкім судом усякіх злачынцаў? Пытаньне гэта ў РСФСР і іншых саюзных рэспубліках за апошні год шырока абгаварвалася ў Праўнай Сэкцыі Камуністычнай Акадэміі, на рабочых сходах, у друку, сярод працаўнікоў, і ў выніку—інстытут абароны вырашана было пакінуць. Матывамі гэтымі зьяўляецца патрэба ў юрыдычнай дапамозе працоўным масам, якія ў большасьці судовых спраў удзельнічаюць. Сацыяльна-клясавы склад тых, што зварачаюцца ў калегію за юрыдычнаю дапамогаю, разнастойны. За першае паўгодзьдзе 1929 г. у кансультацыі калегіі абаронцаў у Менску і акрузе зварачалася 19.214 чал., з іх: 12.386 сялян, з якіх 95 проц. бядняцка-сераднякага складу, 2295 рабочых і служачых, 663 інвалыды, 210 чырвонаармейцаў і вучняў. Але ні можна апраўдць тое, што да гэтага часу яшчэ мае месца абарона ў савецкім судзе непрацоўных, якія зьяўляецца стараною ў працэсе, дзе абарона ўдзельнічае па справах і іншых груп. Гэта зразумела, бо пры наяўнасьці абвінавачваньня ўдзел абароны зьяўляецца абавязковым і незалежна ад гэтага па патрабаваньню тых, што зьвяртаюцца ў кансультацыю за юрыдычнаю дапамогаю, калегія выступае і па справах апошніх.

Тут яшчэ не адкінуты прынцыпы буржуазнай адвакатуры—„абарона для абароны", „абарона ва што-б ні стала".

Склад і кадры калегіі абаронцаў.

Пры ўсіх станоўчых бакох новай арганізацыі савецкай адвакатуры яшчэ ня зьнішчаны шмат якія буйныя недахопы. У многіх выступленьнях у судох абаронцаў ёсьць клясавая ідэалёгічная нявытрыманасьць, якая выклікае абурэньне пралетарскай грамадзкасьці і суду. Часта бываюць выпадкі ўзьняцьця абаронцамі хвайніцтваў аб выкліканьні непатрэбных для справы сьведак, аб правядзеньні непатрэбных мясцовых агляданў, складаньняў неабгрунтаваных заяў, скаргаў і г. д. Усе гэтыя ненармальныя зьявішчы знаходзяцца ў цеснай залежнасьці ад сацыяльнага складу калегіі, якасьці працаўнікоў, ідэалёгічнай вытрыманасьці, кваліфікацыі. Вось чаму праблема кадраў зьяўляецца асноўнаю ў далейшай працы калегіі.

При арганізацыі калегіі ў яе ўвайшлі ўсе тыя, хто лічыў сябе належачым да права—і хутчэй буржуазнага, чым пралетарскага. Калегіі абаронцаў засмечаны такімі людзьмі, якія праводзілі чужую пралетарыяту ідэалёгію. Спыняючыся на старых спэцыялістах-юрыстах, якія ўвайшлі ў савецкую адвакатуру, мы ня кідаем агульнага абвінавачваньня ўсім юрыстам, што прайшлі старую школу. Сярод іх ёсьць значная частка такіх, якія апраўдалі сябе на працы як на пасадзе юрысконсульта ў дзяржаўных і грамадзкіх органах, так і ў савецкай адвакатуры. Гэтую групу ў калегіі абаронцаў трэба захаваць, пакінуць, выкінуўшы з яе шэрагаў усіх тых, ідэалёгічнае чужацтва якіх знайшло сваё выяўленьне ў практычнай працы.

З пачатку гэтага году правяраўся склад калегіі абаронцаў.

Але гэтая праверка далёка сябе не апраўдала. Яна была габіэтная, праводзілася сакрэтна без прыцягненьня пралетарскай грамадзкасьці. У бліжэйшы час будзе праводзіцца чыстка калегіі. Пры дапамозе самакрытыкі і прыцягненьня шырокіх мас працоўных трэба звольніць з калегіі ўвесь нягодны элемэнт, скарыстаўшы гэтую чыстку для азнаямленьня працоўных з сапраўднымі задачамі калегіі абаронцаў. Пры правядзеньні гэтых патрэбных мерапрыёмстваў нельга забываць, што праблема кадраў калегіі абаронцаў упіраецца ў яе праўнае становішча. Прыцягненьню рабочых, сялян, папаўненьню калегіі скончыўшымі савецкія вышэйшыя школы значна перашкаджае тое, што члены калегіі абаронцаў, ня гледячы на новыя калектыўныя формы працы, пры якіх яны атрымоўваюць стаўку ня вышэй сярэдняга савецкага служачага, іншыя ўмовы працы, якія не адрозьніваюцца ад працы па найму, ня маюць праў членаў прафэсыянальных саюзаў. І зусім зразумела, чаму рабочы і вуз'авец ня ідуць у калегію.

Палепшаньне сацыяльнага складу калегіі абаронцаў, апроч чысткі, патрабуе правядзеньня закону аб палепшаньні праўнага становішча асоб, якія ўваходзяць у гэтую арганізацыю. Калегія абаронцаў павінна стаць культурна-асьветнай установай. Даваючы асобе, якая ўваходзіць у гэту арганізацыю, праўную асьвету мас, мы павінны надзяліць яе правамі працоўнага. Гэтая група ўвайшла ў калегію. Гаворачы аб малодым складзе калегіі, трэба адзначыць, што і апошні ня зусім адпавядае сацыяльна здавальняючаму прынцыпу. Далейшае абнаўленьне складу далегіі пралетарскімі кадрамі зьяўляецца баявой задачай дня.

Самакрытыка, набліжэньне да мас, палепшаньне сацыяльнага складу калегіі—вось шляхі яе працы і залог пасьпяховай дзейнасьці.

І. Фрыдман.

З СЁНЕШНІМ НУМАРАМ ГАЗЭТЫ РАССЫЛАЕЦЦА ЧАРГОВЫ НУМАР (8-9) ДАДАТКУ „САВЕТЫ БЕЛАРУСІ"

Зноў аб „Ботвіне".

(АДЧЫНЕНЬНЕ ЗІМОВАГА СЭЗОНУ Ў БЕЛДЗЯРЖТЭАТРЫ).

Пачаўся сэзон «Ботвіным», рэвалюцыйным „Ботвіным", які ў свой час зрабіў тэматычную эпоху ў гэтым тэатры. Тэматычную таму, што «Ботвін» зьявіўся пасьля „Хэйдэра", „Касрылаўкі", «На пакаянным лапцугу», г. зн. пасьля чыста эксперыментальных у спэцыфічна тэатральным сэзоне спэктакляў, у якіх тэматыка ідзе шляхам упадабеньня да пашага сьветапагляду.

„Ботвін" выяўляецца першым вопытам прапрацоўкі арганічна сучаснай, рэвалюцыйна-бальшавіцкай тэмы. Гэта гэраічны жыцьцёпіс камуніста-падпольшчыка, які працуе ў умовах панскай Польшчы, дзе пануе перакананьне, што «усякі жыд—бальшавік» і што ўсякі бальшавік—агэнт Масквы.

У п'есе няма агульнапрызнанай інтрыгі, якая лічыцца неабходнай прыналежнасьцю драматычнага твору.

Тут шэраг „бягучых" падзей, аднолькава важных і аднолькава моцных, аб'яднаных агульнай тэмай—інструкцыйнае клясавае пачуцьцё рабочага-камуніста, якое вырастае ў вялікую магутнасьць правадыра і побач няўстойлівы з бязупынным хістаньнем партыец, які скаціўся да здрадніцтва.

Правакатар (Рудштэйн)—ідэалёгічны кантраст Ботвіна—дасканала перадаў тонкі, амаль паўлоўны пераход ад няўстойлівасьці да правакацыі, хоць сюжэтныя матывы гэтага ня зусім ясныя. Ігра Моіна насычана тэй жывой прастатой, якая адзіна можа выказаць складанасьць тэй справы, што ўтварае Ботвін. Дзякуючы гэтай сваёй прастаце, яму ўдалося амаль вызваліцца ад тэй знадворнай патэтыкі, якая ўтвараецца раздражняючым белым вершам, якім напісана п'еса.

Непатрэбная высокамоўнасьць, якая стварaецца белым вершам (ня вершам наогул), зьніжае ўнутраны пафас рэчы. І гэту высокамоўнасьць артыстам не ўдалося вывучыць.

У Вольшынай (Фэліцыі) гэта вострая адчуваецца і ідзе ў разрэз з вобразам распуснай, малакультурнай жанчыны, з гэтым паразытычным прадуктам буржуазнае грамады.

Калі-б ня гэты прыкры недахоп, вобраз быў-бы поўным.

Вальцэр, які быў у стрыманым эканомным выкананьні Норда натхнёнай моцай партыі, не мазгом—у выкананьні Аронэса абвяргуўся ў ніякі. Дэфэкт гутаркі (заіканьне) быў у Норда вынікам рэвалюцыйнай патэтыцы і энтузіязму, у Аронэса дзіцячае „в" замест „л"—нічога не вылуплае.

Высоцкая (мадам Купэркноп) крыху горш за Фішэр, якая раней выконвала гэтую ролю. Фішэр была больш рэзкая, а таму больш яскрая і характэрная.

Піонткоўскі (Рывін), трактаваны ў рэалістычным пляне, мае ў сабе мала арыгінальнага. Тут атрыбуты звычайнага „ахраньніка": хітрасьць побач з грубасьцю. Усё-ж, з пункту погляду рэалістычнай трактоўкі роля зроблена моцна.

У агульным афармленьні спэктакля заўважваецца недахоп адзінства. Цікавая думка прадметнай сымболікі канструкцыі (рэклямы—як выяўленьня заходня-эўрапейскае вуліцы) ідзе побач з пустатой сьцен ботвінскае кватэры, якая нічога ня кажа.

Незразумела чаму, калі ў афармленьні ўсяго спэктаклю ўведзена адмова ад сьцяны, раптам вырастаюць сьцены ў кватэры Ботвіна.

Ня гледзячы на тое, што тэатр ужо перасягнуў дасягненьні гэтае пастаноўкі, усё-ж спэктакль застаецца даволі цікавым па актуальнасьці тэмы, па тэй думцы ў афармленьні, якая ў сутнасьці застаецца значнай і па моцы індывідуальнай ігры артыстаў.

С. Лондаў.

Што слухаць па радыё

СЕРАДА, 16-га КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з яўрэйскім аддзелам).
17-40—Пасьляабеданны канцэрт (опэрныя, урыўкі і нар. музыка).
18-30—Беларускі батрак.
19-00—Беларуская радыё-газэта (польскі аддзел).
20-00—Паверка часу.
20-00—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт:—тэхніка самаадукацыі і гісторыя клясавай барацьбы.
21-00—Камсамольская перадачы.
21-30—Гістарычны канцэрт.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

ЧАЦЬВЕР, 17-га КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Гадзіна акцябрат.
17-30—Новыя моманты працы прафсаюзаў—Клімковіч.
18-00—Рабоча-СялянскіРадыё-Унівэрсытэт
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Паверка часу.
20-00—Гадзіна студэнта.
20-30—Час манёры і гаспадыні.
21-00—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт:—тэхніка самаадукацыі і лекцыя на прам. тэхнічн. факультэту.
21-30—Трансляцыя.

ПЯТНІЦА, 18-га КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Гадзіна піянэра і вучня.
17-40—Сялянская гадзіна: сродкі агрэмаджанага сэктару народнай гаспадаркі (адзіны фінплян)—Малкамановіч.
18-00—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт:—тэхніка самаадукацыі і лекцыя аб калектывізацыі.
19-00—Беларуская радыё-газэта (лат. аддзел).
20-00—Паверка часу.
20-00—Праца грамадзкіх арганізацый.
20-25—Перадача на мове эсэранто:—ахова працы ў савецкай дзяржаве.
20-40—Інфармацыя ўраду.
21-00—Этнаграфічны канцэрт.
23-00—Азбука „Морзе".

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 16-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.95,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.75	129.75
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.35	100.75
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.58	25,68
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.01	—
Дзярж. паз. узм. сіл. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25,21	25.31
2 „ „ „ проц.	25.34½	25.44½
2 „ „ „ 6-проц.	25.34½	25.44½
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.36	101.41
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.44	—

Паштовая скрынка.

Зоркаму. Койданаўскі р. Допіс „Грубыя адносіны..." пераслалі ў Менскую акр. інспэктуру Нарасьветы.

К. Менск. Допіс „Факты і факцікі ў тэхнікуме" пераслалі ў Наркамасьветы.

Асьветніку. Допіс „Конкурс на лепшага інспэктара" пераслалі ў Аршанскую Акруговую РСІ

Хв. Шпаку. Талочын. Пераслалі ў Копыскі РМК асьветнікаў.

Бязбожніку. Нараўляншчы р. Відаць, [illegible] шы бязбожнікі праспалі надыход сьвята Юр'я, а поп тым часам і разьбінуў сваю агітацыю.

П. Дубовіку. Слуцак. Ваш ліст пераслалі ў Наркамасьветы для ўрэгуляваньня вашай справы.

Я. і І. Каратневічам. Магілеўшчына. Ваш ліст пераслалі ў Магілеўскі акрвыканком.

Зорцы. Пухавічы. Допіс „Дваранка XIX веку" пераслалі ў Наркамасьветы.

Апавяшчэньні.

Сёньня, а 7 гадз. вечара, у клюбе друкароў адбудзецца агульны сход працаўнікоў друку, на якім зробіць даклад старшыня ЦП сэкцыі друку т. Лазар.

Тэма дакладу—„ДРУК І ЯГО ПРАЦАЎНІКІ".

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 16-га кастр. адбудзецца экскурсія членаў ЮС дому асьветы ў музэй рэвалюцыі.

Збор у доме а 12 гадзіне дня.

— 17 кастр. а 8 гадз. адбудзецца арганізацыйны сход усіх гурткоў і курсаў пры доме. Яўка ўсіх запісаўшыхся абавязкова.

Пасьля сходу кіно!

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзел